Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 33 (447) | Чацвер, 21 верасня 1939 года | Цана 20 кап.

Увесь народ вітае рашэнне совецкага ўрада аб аказанні дапамогі братам-беларусам і братам-украінцам.

Прывітанне вызваленым з-пад польскага ярма братам—беларусам і украінцам!

ПРАМОВА ПА РАДЫЁ СТАРШЫНІ СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР тав. В. М. МОЛАТАВА

17 верасня 1939 г.

Таварышы! Грамадзяне і грамадзянкі нашай вялікай краіны!

Падзеі, выкліканыя польска-германскай вайной, паказалі ўнутраную несастаяцельнасць і яўную нядзеездольнасць польскай дзяржавы. Польскія правячыя кругі абанкроціліся. Усё гэта адбылося за самы кароткі тэрмін.

Прайшло якіх-небудзь два тыдні, а Польшча ўжо страціла ўсе свае прамысловыя ачагі, страціла большую частку буйных гарадоў і культурных цэнтраў. Няма больш і Варшавы, як сталіцы польскай дзяржавы. Ніхто не ведае аб месцапрабыванні польскага ўрада. Насельніцтва Польшчы кінута яго незадачлівымі кіраўнікамі на волю лёсу. Польская дзяржава і яе ўрад фактычна перасталі існаваць. У сілу такога становішча заключаныя паміж Совецкім Саюзам і Польшчай дагаворы спынілі сваё дзеянне.

У Польшчы стварылася становішча, якое патрабуе з боку Совецкага ўрада асобых клопатаў у адносінах бяспекі сваёй дзяржавы. Польшча стала зручным полем для ўсякіх выпадковасцей і нечаканасцей, якія могуць стварыць пагрозу для СССР. Совецкі ўрад да апошняга часу аставаўся нейтральным. Але ён у сілу ўказаных акалічнасцей не можа больш нейтральна адносіцца да стварыўшагася становішча.

Ад Совецкага ўрада нельга таксама патрабаваць абыякавых адносін да лёсу аднакроўных украінцаў і беларусаў, якія пражываюць у Польшчы і раней знаходзіліся на становішчы бяспраўных нацый, а цяпер і зусім кінуты на волю выпадку. Совецкі ўрад лічыць сваім свяшчэнным абавязкам падаць руку дапамогі сваім братам-украінцам і братам-беларусам, якія насяляюць Польшчу.

З прычыны ўсяго гэтага ўрад СССР перадаў сёння раніцою ноту польскаму паслу ў Маскве, у якой заявіў, што Совецкі ўрад аддаў распараджэнне Галоўнаму Камандаванню Чырвонай Арміі даць загад войскам перайсці граніцу і ўзяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

Совецкі ўрад заявіў таксама ў гэтай ноце, што адначасова ён мае намер прыняць усе меры к таму, каб вызваліць польскі народ са злапалучнай вайны, куды ён быў увергнут яго неразумнымі кіраўнікамі і даць яму магчымасць зажыць мірным жыццём.

У першых чыслах верасня, калі праводзіўся частковы прызыў запасных у Чырвоную Армію на Украіне, у Беларусі і яшчэ ў чатырох ваенных акругах, становішча ў Польшчы было няясным, і гэты прызыў праводзіўся, як мера перасцярогі. Ніхто не мог думаць, што польская дзяржава выявіць такое бяссілле і такі быстры развал, які цяпер ужо мае месца ва ўсёй Польшчы. Паколькі, аднак, гэты развал у наяўнасці, а польскія дзеячы поўнасцю абанкроціліся і нядзольны змяніць становішча ў Польшчы, наша Чырвоная Армія, атрымаўшы буйнае папаўненне па апошняму прызыву запасных, павінна з чэсцю выканаць пастаўленую перад ёю пачотную задачу.

Урад выражае цвёрдую ўпэўненасць, што наша Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія пакажа і на гэты раз сваю баявую магутнасць, свядомасць і дысцыпліну, што выкананне сваёй вялікай вызваленчай задачы яна пакрые новымі подвігамі, геразмам і славай.

Разам з тым, Совецкі ўрад прэправодзіў копію сваёй ноты на імя польскага пасла ўсім урадам, з якімі СССР мае дыпламатычныя адносіны, і пры гэтым заявіў, што Совецкі Саюз будзе праводзіць палітыку нейтралітэта ў адносінах усіх гэтых краін.

Гэтым вызначаюцца нашы апошнія мерапрыемствы па лініі знешняй палітыкі.

Урад звяртаецца таксама да грамадзян Совецкага Саюза з наступным разъясненнем. У сувязі з прызывам запасных сярод нашых грамадзян заўважылася імкненне накапіць пабольш харчоў і іншых тавараў з-за баязні, што будзе ўведзена картачная сістэма ў галіне снабжэння. Урад лічыць неабходным заявіць, што ён не мае намеру ўводзіць картачнай сістэмы на прадукты і промтавары, нават, калі выкліканыя знешнімі падзеямі дзяржаўныя меры зацягнуцца на некаторы час. Баюся, што ад празмерных закупак харчоў і тавараў пацерпяць толькі тыя, хто будзе гэтым займацца і накапляць непатрэбныя запасы, падвяргаючы іх небяспецы псавання. Наша краіна забяспечана ўсім неабходным і можа абыйсціся без картачнай сістэмы ў снабжэнні.

Наша задача цяпер, задача кожнага рабочага і селяніна, задача кожнага служачага і інтэлігента, заключаецца ў тым, каб чэсна і самааддана працаваць на сваім пасту і тым аказваць дапамогу Чырвонай Арміі.

Што датычыць байцоў нашай слаўнай Чырвонай Арміі, то я не сумняваюся, што яны выканаюць свой абавязак перад радзімай з чэсцю і са славай.

Народы Совецкага Саюза, усе грамадзяне і грамадзянкі нашай краіны, байцы Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота згуртаваны, як ніколі, вакол Совецкага Ўрада, вакол нашай большэвіцкай партыі, вакол свайго вялікага правадыра, вакол мудрага таварыша Сталіна, для новых і яшчэ нябачаных поспехаў працы ў прамысловасці і ў калгасах, для новых слаўных перамог Чырвонай Арміі на баявых франтах.

БРАТЫ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ!

Я хачу, каб вы пачулі мой голас і словы мае, што ідуць ад чыстага сэрца.

Больш дваццаці гадоў нас разлучала граніца, рассекшы на дзве часткі жывое цела народа, яго зямлю.

Рознымі дарогамі ішло наша жыццё па адзін і па другі бок граніцы. Дваццаць гадоў мы будуем свой дабрабыт, сваю культуру, свае мастацтва, свае школы, навуку. Дваццаць гадоў не ведаем мы нацыянальнага гнёту, панскай няволі, здзеку і гвалту чалавека над чалавекам. Сваімі ўласнымі працавітымі рукамі мы ствараем сваё жыццё, радасна і ўпэўнена пазіраем у вочы заўтрашняму дню. Нас не палохае голад, бясхлебіца, беспрацоўе. Нас не трывожыць лёс нашых дзяцей — ім расчынены шырокія, прасторныя дарогі ў жыццё.

Але наша радасць не была поўнай, бо мы чулі ваш голас пакуты, мы ведаем пра вашу галечу, цемру, нацыянальны гнёт і бяспраўе, паланізацыю, асаднітства. Чатыры гады таму назад я праязджаў праз Заходнюю Беларусь. З акна вагона бачыў я тыя мясціны, па якіх ужо даўно тысячы разоў хадзілі мае ногі. Пачуццё горычы сціскала мне сэрца, калі пазіраў я на вузенькія палоскі, на ўбогія хаты, на прыбітыя горам невясёлыя постаці сваіх братоў. Нярадасныя, даўно забытыя перажыванні паўставалі зноў. Я напісаў тады вам прысвячэнне «З дарогі», якое быць можа да вас і не дайшло.

«Па сходзе многіх дзён
Я зноў зірнуў у вочы родным долам —
Зняменне. ціш і сон.
Убоства і прыгон.
За крыжам крыж, астрогі ды касцёлы...
Дзе-ж посулы паноў.
Іх лёкаяў аб роўнасці, аб волі?
У звянканні званоў.
У звоне кайданоў.
У свісце бізуноў.
У голадзе, асадніцтве, падполлі»...

Браты! Адбыўся суд гісторыі. Жудасным акордам трывогі, слёз, пакуты, знішчэння і смерці канчаецца панскае панаванне. У бяздонне нязноснага гора ўвёў панскі ўрад сваю дзяржаву і народы, а сам збег ганебна. Ці маглі мы спакойна стаяць у баку і глядзець на вашу пакуту? Наша сэрца сказала: «Даволі!». І народы Совецкага Саюза ў асобе сваёй Чырвонай Арміі прыйшлі к вам на дапамогу і падаюць руку братняга падтрымання. З адкрытай душой паціснеце гэту руку: яна нясе вам спакой, волю і высокую годнасць чалавека. Смела і адкрыта, адкінуўшы чмут і хлусню паноў і іх прыслужнікаў аб тых жахах, якія нібыта прынясе вам большэвік, зірнеце ў вочы байцу Чырвонай Арміі — ён брат ваш і друг. А панскі чмут рассеецца, як гнілы туман на чыстым усходнім ветры.

Якуб КОЛАС,
народны паэт БССР, орданосец.

П. Глебка

РОДНЫМ БРАТАМ

Родны брат мой, таварыш гаротны,
Сонца праўды і волю вітай.
Станавіся ў шарэнгі свабодных
Будаваць свой разбураны край!

Нас адна нарадзіла краіна,
Ды няроўнае шчасце дала:
Мы квітнелі,раслі безупынна, —
Ваша доля пакутнай была.

У кацяным ад поту шарачку,
Зруйнаваны пакінуўшы дом,
Ваша маці стаяла жабрачкай
На марозе пад панскім акном;

Сёстры мерлі на вуліцах брудных;
Ад цямна да цямна праз вякі
За сахою хадзілі пакутнай,
Парабкамі служылі бацькі.

Край Заходні зямлі Беларускай,
Край, растоптаны панскай нагой,
Колькі слёз на палях тваіх вузкіх,
Колькі здзекаў, аблітых крывёй!

Годзе гэтых пакут і знямогі,
Вызваляйся з няволі і з крат!
Па-братэрску руку дапамогі
Падаем мы табе, родны брат.

Крочы у новыя, светлыя далі,
Разарваўшы прымусу дапиуг!
За цябе непакоіцца Сталін —
Усіх прыгнечаных бацька і друг.

Заходнім беларусам

Мае браты! У цяжкой няволі
Пакуты церпячы, прыгнёт,
Вы марылі аб лепшай долі
З надзеяй гледзячы на Ўсход.

Надзея поўніла вам грудзі
І мроілася час блізкі той,
Калі мы жыць шчасліва будзем
Адной зямлёй,
Адной сям'ёй.

І сталі явай летуценні,
Знік сон з расплюшчаных павек.
Прыгнёт знішчаецца навек
І льюцца песні вызвалення!

І ў песнях тых з грудзей свабодных
Гучыць узнёслая хвала,
Таму, чыя рука народы
Да лепшай долі прывяла.

Андрэй УШАКОЎ.



ГІСТАРЫЧНАЕ РАШЭННЕ

17 верасня войскі доблеснай Чырвонай Арміі па распараджэнню Совецкага Ўрада перайшлі граніцу, каб узяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Мыслі і пачуцці ўсяго совецкага народа — з горача любімай, роднай, непераможнай Чырвонай Арміяй. Слаўныя байцы ідуць на воінскія подвігі пад геройчным сцягам партыі Леніна—Сталіна, апіраючыся на магутнасць і сілу ўсёй совецкай краіны. Яна пасылае ім сваё палкае большэвіцкае прывітанне. Яна ганарыцца сваімі сынамі, якія выконваюць высокі свяшчэнны абавязак: абарону аднакроўных нашых братоў—украінцаў і беларусаў, якія пакутвалі доўга ў цяжкай няволі ў польскіх паноў.

Увесь многамільённы совецкі народ з найглыбейшай увагай слухаў гістарычную прамову па радыё Старшыні Совета Народных Камісараў СССР тав. В. М. Молатава. У гэтай выдатнай прамове, у ноце Ўрада СССР, уручанай польскаму паслу ў Маскве, паказаны змяненні ў міжнароднай абстаноўцы, у сілу якіх Совецкі Ўрад аддаў распараджэнне галоўнаму камандаванню Чырвонай Арміі даць загад войскам перайсці граніцу.

«Польска-германская вайна выявіла ўнутраную несастаяцельнасць польскай дзяржавы. На працягу дзесяці дзён ваенных аперацый Польшча страціла ўсе свае прамысловыя раёны і культурныя цэнтры. Варшава, як сталіца Польшчы, не існуе больш. Польскі Ўрад распаўся і не праяўляе прызнакаў жыцця. Гэта значыць, што польская дзяржава і яго Ўрад фактычна перасталі існаваць. Тым самым спынілі сваё дзеянне дагаворы, заключаныя паміж СССР і Польшчай»— указваецца ў ноце Ўрада СССР, уручанай польскаму паслу ў Маскве.

Польская ласкутная дзяржава, пабудаваная на прыгнечанні, на грабяжы нацыянальных меншасцей, паказала ўсю сваю нежыццяздольнасць, сваю ўнутраную несастаяцельнасць, развалілася, як картачны домік. У самы кароткі тэрмін польскія правячыя кругі абанкроціліся. Мізэрны ўрад Польшчы збег, кінуўшы народ на волю лёсу. Армія не мела ні аднаго аператыўнага поспеху. Значная яе частка навербавана насільственна з нацыянальных меншасцей, якія ненавідзяць панскую Польшчу — турму народаў. Ясна, што такая армія не здольна паспяхова ваяваць.

Становішча, якое стварылася ў Польшчы, распад польскай дзяржавы, анархія і беспарадак, вацарыўшыяся ў Польшчы, зрабілі Польшчу зручным полем для ўсякіх выпадковасцей і нечаканасцей, якія могуць стварыць пагрозу для СССР. У сілу ўказаных абставін, Совецкі Ўрад не мог больш нейтральна адносіцца да стварыўшагася становішча. Совецкі Ўрад не мог таксама абыякава адносіцца да лёсу аднакроўных украінцаў і беларусаў, якія пражываюць у Польшчы, не мог пакінуць іх безабароннымі.

«Совецкі Ўрад лічыць сваім свяшчэнным абавязкам падаць руку дапамогі сваім братам-украінцам і братам-беларусам, якія насяляюць Польшчу». З быстратой маланкі абляцелі гэтыя хвалюючыя словы таварыша В. М. Молатава ўсю нашу краіну. Усюды яны выклікалі велізарны ўздым. Усіх запалілі энтузіязмам барацьбы і перамогі. Гэтыя словы паўтораны ў тысячах рэзалюцый, мітынгаў і сходаў. Іх вымаўляюць пры сустрэчах совецкія грамадзяне.

Учора апублікавана паведамленне аб бегстве польскага ўрада ў Румынію. Гэта яшчэ раз пацвярджае факт поўнага распаду польскай дзяржавы. Усюды ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне совецкія войскі быстра прасоўваюцца ўперад, не сустракаючы колькі-небудзь сур'ёзнага супраціўлення. Гэта таксама гаворыць яшчэ раз аб поўным развале і разлажэнні польскай дзяржавы, польскай арміі.

З захапленнем і лікаваннем сустракаюць нашы браты — заходнія украінцы і беларусы — доблесную Чырвоную Армію, якая вызваляе іх ад нацыянальнага гнёту, ад гнёту польскіх паноў-памешчыкаў. Са слязьмі радасці кідаюцца працоўныя Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ў абдымкі к камандзірам і чырвонаармейцам, праяўляюць чуллівыя клопаты аб Чырвонай Арміі. Жыхары выходзяць насустрач, апранутыя па-святочнаму, прыносяць кветкі, частуюць байцоў яблыкамі, малаком.

Жыхары Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі сустракаюць Чырвоную Армію, як армію — вызваліцельніцу, як армію брацкага народа, які хоча дапамагчы ім зажыць шчаслівым і мірным жыццём. Хваля любві к братам з Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі нясецца ўслед нашай Чырвонай Арміі. Гэта любоў акрыляе нашых байцоў. Гэту дружбу і любоў адчуе кожны ўкраінец, кожны беларус ва ўбогіх, разоронных панамі хацінках на тэрыторыі былой польскай дзяржавы.

Са спакойнай і велічнай сілай выконвае совецкая краіна сваю свяшчэнную задачу. Як адзін чалавек, адгукнулася яна з велізарнай магутнасцю на прамову главы Совецкага Ўрада. Непарыўна еднанне ўсяго совецкага народа са сваім урадам, са сваёй роднай большэвіцкай партыяй, са сваім вялікім правадыром таварышам Сталіным.

Совецкі Саюз хоча жыць у міры з усімі краінамі. Совецкі Ўрад ва ўвесь голас заявіў, што Совецкі Саюз будзе праводзіць палітыку нейтралітэта ў адносінах усіх краін, з якімі СССР мае дыпламатычныя адносіны. У інтарэсах міру быў заключан пакт аб ненападзе паміж СССР і Германіяй. Германа-совецкае камюніке 18 верасня паказвае, што пакт аб ненападзе знаходзіцца ў дзеянні. Урад СССР і ўрад Германіі заяўляюць, што дзеянні совецкіх і германскіх войск «Не праследуюць якой-небудзь мэты, якая ідзе ў разрэз інтарэсаў Германіі або Совецкага Саюза і супярэчыць духу і літары пакта аб ненападзе, заключанага паміж Германіяй і СССР. Задача гэтых войск, — гаворыцца ў камюніке,— наадварот, заключаецца ў тым, каб аднавіць у Польшчы парадак і спакой, нарушаныя распадам польскай дзяржавы, і дапамагчы насельніцтву Польшчы перабудаваць умовы свайго дзяржаўнага існавання».

Вялікі патрыятычны ўздым ахапіў нашу краіну. Усхваляваныя прамовы гучаць на мітынгах. У гэтых прамовах, у рэзалюцыях мітынгаў — поўнае адабрэнне мудрай знешняй палітыкі Совецкага Ўрада і гатоўнасць аддаць усе сілы на карысць нашай радзімы.

Рабочыя і служачыя Кіраўскага завода (Ленінград) у рэзалюцыі 18-ці тысячнага мітынга гавораць:

«Рашэнне Ўрада аб заняцці часцямі Чырвонай Арміі Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ёсць выражэнне волі ўсяго 170-мільённага совецкага народа... Адабраючы палітыку нашага Ўрада, калектыў кіраўцаў запэўнівае партыю, урад і правадыра народаў таварыша Сталіна, што мы прыкладзем усе свае сілы і энергію да далейшага павышэння прадукцыйнасці працы, павелічэння выпуску прадукцыі для ўмацавання ваеннай магутнасці нашай любімай радзімы».

Рабочыя, служачыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі завода «Укркабель» звярачаюцца да аднакроўных народаў:

«Мы з вамі, дарагія браты Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі! Мы не астанемся абыякавымі да вашага лёсу. Мы гатовы па першаму закліку нашага совецкага Ўрада, нашай партыі, роднага Сталіна стаць у рады РСЧА і дапамагчы вам разграміць польскіх паноў і вызваліцца ад гнёту і эксплаатацыі».

Наша Чырвоная Армія з чэсцю выконвае свой абавязак. Яна далучыць новыя перамогі да слаўных перамог, упісаных у геройчную гісторыю совецкай краіны. Няхай з чэсцю выконвае свой абавязак кожны грамадзянін на сваім пасту — за станком на заводзе, за плугам на калгасных палях, ва ўстанове, за прылаўкам, на кафедры, у лабараторыі. Кожны рабочы пост у нашай краіне — гэта баявы пост.

«Народы Совецкага Саюза, усе грамадзяне і грамадзянкі нашай краіны, байцы Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, згуртаваны, як ніколі, вакол Совецкага Ўрада, вакол нашай большэвіцкай партыі, вакол вялікага правадыра, вакол мудрага таварыша Сталіна, для новых і яшчэ нябачаных поспехаў працы ў прамысловасці і ў калгасах, для новых слаўных перамог Чырвонай Арміі на баявых франтах». (Молатаў).

(«Праўда»).

НОТА УРАДА СССР, УРУЧАНАЯ ПОЛЬСКАМУ ПАСЛУ У МАСКВЕ РАНІЦАЙ 17 ВЕРАСНЯ 1939 ГОДА

Пан пасол!

Польска-германская вайна выявіла ўнутраную несастаяцельнасць польскай дзяржавы. На працягу дзесяці дзён ваенных аперацый Польшча страціла ўсе свае прамысловыя раёны і культурныя цэнтры. Варшава, як сталіца Польшчы, не існуе больш. Польскі ўрад распаўся і не праяўляе прызнакаў жыцця. Гэта значыць, што польская дзяржава і яе ўрад фактычна перасталі існаваць. Тым самым спынілі свае дзеянні дагаворы, заключаныя паміж СССР і Польшчай. Прадастаўленая самой сабе і накінутая без кіраўніцтва, Польшча ператварылася ў зручнае поле для ўсякіх выпадковасцей і нечаканасцей, якія могуць стварыць пагрозу для СССР. Таму, будучы дагэтуль нейтральным, Совецкі ўрад не можа больш нейтральна адносіцца да гэтых фактаў.

Совецкі ўрад не можа таксама абыякава адносіцца к таму, каб аднакроўныя украінцы і беларусы, якія пражываюць на тэрыторыі Польшчы, кінутыя на волю лёсу, заставаліся безабароннымі.

У сувязі з такой абстаноўкай Совецкі ўрад аддаў распараджэнне Галоўнаму камандаванню Чырвонай Арміі даць загад войскам перайсці граніцу і ўзяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

Адначасова Совецкі ўрад мае намер прыняць усе меры к таму, каб вызваліць польскі народ са злапалучнай вайны, куды ён быў увергнут яго неразумнымі кіраўнікамі, і даць яму магчымасць зажыць мірным жыццём.

Прыміце, пан пасол, запэўненні ў поўнай да Вас павазе.

Народны Камісар Замежных Спраў СССР В. МОЛАТАЎ.

Надзвычайнаму і поўнамоцнаму паслу Польшчы п. Гжыбоўскаму.
Польскае пасольства
Масква.

НОТА ЎРАДА СССР, УРУЧАНАЯ РАНІЦАЙ 17 ВЕРАСНЯ 1939 ГОДА ПАСЛАМ І ПАСЛАННІКАМ ДЗЯРЖАЎ, МАЮЧЫХ ДЫПЛАМАТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ З СССР

Пан пасол,

Прэправаджаючы Вам прыкладаемую пры гэтым ноту Ўрада СССР ад 17 верасня г.г. на імя польскага пасла ў Маскве, маю чэсць па даручэнню Ўрада заявіць Вам, што СССР будзе праводзіць палітыку нейтралітэта ў адносінах паміж СССР і (найменаванне краіны)*).

Прыміце, пан Пасол, запэўненні ў поўнай да Вас павазе.

Народны Камісар Замежных Спраў Саюза ССР В. МОЛАТАЎ.

17 верасня 1939 года.

*) Гэты тэкст накіраван дыпламатычным прадстаўнікам Германіі, Італіі, Ірана, Кітая, Японіі, Велікабрытаніі, Францыі, Афганістана, ЗША, Турцыі, Фінляндыі, Балгарыі, Латвіі, Мангольскай Народнай Рэспублікі, Даніі, Эстоніі, Швецыі, Грэцыі, Бельгіі, Румыніі, Тувінскай Народнай Рэспублікі, Літвы, Нарвегіі, Венгрыі.

АДНАДУШНА УХВАЛЯЕМ ПАЛІТЫКУ СОВЕЦКАГА ЎРАДА

* * *

Няхай жыве дружба народаў СССР!

Разам з усім совецкім народам, разам з усімі працоўнымі вялікага Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік мы, пісьменнікі і супрацоўнікі Саюза совецкіх пісьменнікаў ордэнаноснай Беларускай рэспублікі, горача, ад усяго сэрца, вітаем мудрае рашэнне нашага ўрада аб аказанні братэрскай дапамогі беларусам і украінцам, якія на працягу дваццаці гадоў па-зверску прыгняталіся польскімі панамі. Нашы думкі, нашы пачуцці ў гэты гістарычны момант разам з слаўнай і гераічнай Чырвонай Арміяй, якая вызваляе нашых кроўных братоў беларусаў і украінцаў ад нацыянальнага і соцыяльнага прыгнёту, ад жахаў вайны, вымірання, галецтва, ад культурнага адзічання і крывавых пагромаў, ад жаўнерскага бізуна.

Мы ведаем і ніколі не забудзем усяго, што рабілі польскія каланізатары ў беларускіх і украінскіх гарадах і вёсках. Усяму гэтаму наша магутная і непераможная Чырвоная Армія паложыць канец назаўсёды, і раней прыгнечаныя беларусы і украінцы знойдуць шчаслівае жыццё ў Саюзе Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. Са свайго боку кожны з нас гатоў аддаць усе свае сілы, каб выканаць свой інтэрнацыянальны доўг перад нашымі братамі украінцамі і беларусамі.

Няхай жывуць нашы браты беларусы і украінцы, вызваленыя з-пад ярма польскага фашызма!

Няхай жыве наша вялікая соцыялістычная радзіма!

Няхай жыве дружба народаў Совецкага Саюза!

Няхай жыве магутная і непераможная Чырвоная Армія!

Няхай жыве вялікі і мудры друг і правадыр працоўных усяго свету Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

У імя большэвіцкага гуманізма

Бура апладысментаў. Радаснымі воклічамі сустрэў наш калектыў паведамленне таварыша Молатава аб аказанні дапамогі брацкім народам Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў вызваленні іх ад ярма польскіх імперыялістаў. Гэту радасць адчувалі сёння ўсе працоўныя Совецкага Саюза.

Пачуццё незвычайнай гордасці за нашага Сталіна, за нашу вялікую большэвіцкую партыю, выразіўшую волю нашага шматмільённага Совецкага народа, ахапіла нас, калі мы слухалі паведамленне таварыша Молатава.

Палітыка нашай краіны ясная, яна прадыктавана жаданнем захаваць мір, прадыктавана жаданнем рэальна дапамагаць народам, змагаючымся за сваё вызваленне. Наша Чырвоная Армія — адзіная армія ў свеце, якая не праследуе заваявальных мэтаў. Яна пасунула межы ў імя вызвалення прыгнечаных братоў — працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, у імя большэвіцкага гуманізма.

Таварышы байцы, камандзіры, палітработнікі нашай слаўнай Чырвонай Арміі! У гэтай свяшчэннай вызваленчай вайне, у гэтым выкананні гістарычнай місіі, ускладзенай на вас большэвіцкай партыяй і совецкім урадам, вы, дасканала валодаючыя інструментам сталінскіх перамог, пакрыўшыя сябе неўміручай славай ля возера Хасан і ў Манголіі, вы і тут з гонарам выканаеце баявое заданне і яшчэ раз напішаце на вашых сцягах: «Сталінскае заданне выканана».

Слава вялікай Чырвонай Арміі, носьбіту ідэй комунізма!

Слава яе жалезным палкаводцам!

Натхніцелю нашых вялікіх перамог — таварышу Сталіну — слава!

Засл. арт. БССР С. С. БІРЫЛА,
Засл. арт. БССР М. А. ЗОРАЎ,
Нам. дырэктара БДДТ А. Г. ГАЙДАРЫН.



На прадпрыемствах горада Мінска адбыліся шматлюдныя мітынгі, прысвечаныя прамове па радыё старшыні СНК СССР таварыша В. М. Молатава. Працоўныя сталіцы БССР аднадушна ўхваляюць рашэнне ўрада аб дапамозе народам Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.
На здымку: мітынг на станкабудаўнічым заводзе імя Кірава.
Фото Б. А. Вернера (Фотахроніка БЕЛТА).

ЦЁПЛАЯ СУСТРЭЧА

18 верасня наша брыгада суправаджала поезд на ст. Алехновікі (Заходняя Беларусь).

Як толькі прыбыў на станцыю наш поезд, натоўпы сялян, апрануўшыся ў лепшае сваё адзенне, прышлі паглядзець на наш пасажырскі паравоз, прышлі пагутарыць і даведацца, як жывуць працоўныя Совецкай Беларусі.

Яны былі здзіўлены, што на паравозе ў Совецкім Саюзе можа працаваць жанчына. Пачаліся распыты, ці шмат трэба вучыцца для таго, каб стаць памочнікам машыніста, ці цяжка працаваць на паравозе.

Дзяўчаты распытвалі, ці ёсць у нас школы, колькі трэба плаціць за навучанне.

Яны былі здзіўлены, калі я расказала, што ў нас вучыцца не толькі моладзь, але і старыя, што навучанне ў нас бясплатнае, а ў вышэйшых навучальных установах навучаючымся плоцяць грошы.

Шмат пыталіся яны і аб тым, ці будуць прыходзіць нашы паязды, калі я прыеду у наступны раз.

А калі наш паравоз даў свісток адпраўлення, сотні рук сабраўшыхся доўга махалі ўслед адыходзячаму поезду, дзякуючы за цёплую таварыскую сустрэчу.

О. К. ШПАКОЎСКАЯ,
нам. машыніста паравоза СУ 206-72.

З ІМЕНЕМ СТАЛІНА НА ВУСНАХ

У гэтую ноч мала хто спаў. Веліч гістарычнай задачы, якая выпала на долю Чырвонай Арміі, напоўніла нашыя сэрцы пачуццём вялікай гордасці за сваю соцыялістычную радзіму. Мы ірваліся ў бой за шчасце нашых братоў—працоўных Заходняй Беларусі. Хутчэй-бы ў бой! Так думалі ўсе мы. Баявы парыў аб'еднаў нас у магутнае цэлае. Паміж падраздзяленнямі былі заключаны соцыялістычныя дагаворы на тое, хто першым уварвецца ў польскую стражніцу (польская пагранічная застава).

Доўгачаканы час надышоў. Бясшумна, імклівым маршам мы перасеклі граніцу. Ноч выдалася цёмная. У двух кроках нічога не відаць.

Старшы лейтэнант тав. Трэгубаў з байцом Бескаравайным пайшлі ў баявую разведку. Яны дакладна ўстанавілі месца размяшчэння стражніцы. Падзяліўшыся на дзве часткі, мы з двух бакоў пайшлі на акружэнне. Тав. Грыбаў павёў адну частку, я другую.

Лес кончыўся.

Уперадзе — адкрытая раўніна. На ўзгорку, накшталт крэпасці, высіцца стражніца. Паўзком, нізка прыгібаючыся да зямлі, мы ішлі наперад. Наша шчыльнае кальцо сціснула заставу. Два байцы атрымалі заданне зняць паставога. Яны пайшлі наперад. Мёртвую цішыню раптоўна нарушыў стрэл.


Пачалося...

Нашыя кулямётчыкі адкрылі агонь па стражніцы. У адказ раздаліся стрэлы з боку палякаў. Тав. Трэгубаў з запальваючымі воклічамі: «За мной, таварышы! За радзіму, за Сталіна, за шчасце абяздоленых братоў!» — падняў падраздзяленне ў атаку.

Сакрушальнай лавінай мы рвануліся наперад, на ворага. У вокны стражніцы паляцелі гранаты. Палякі не здаваліся. Яны адказвалі гранатамі, якія кідалі з вокнаў. Польскі капрал забраўся на вышку і адтуль адкрыў агонь. Яго хутка супакоілі гранатамі. Ніхто з супраціўляўшыхся палякаў не астаўся ў жывых.

Усё наша падраздзяленне складалася з комсамольцаў. У баю ўсе яны паказалі сябе сапраўднымі патрыётамі сваёй вялікай радзімы, да канца вернымі сваёй клятве, перад радзімай.

Палітрук Я. С. КРАЎЧАНКА.



Насельніцтва вызваленай Заходняй Беларусі вітае совецкіх танкістаў.

ГІСТАРЫЧНАЯ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ

Шчаслівы, радасны момант!

Адбылася вялікая гістарычная справядлівасць.

Адбылася вялікая справа вызвалення народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Два дзесяцігоддзі панская Польшча трымала ў жудасных пакутах беларускі і украінскі народы, якія апынуліся пад уладай польскай дзяржавы. Гэта дзяржава бязлітасна і неміласэрдна душыла народы. Раз'юшанае польскае панства адабрала ў народа ўсё: і зямлю, палітую яго потам і крывёю, і чалавечую долю. Топчучы паганымі нагамі свяшчэнную зямлю беларускага і украінскага народаў, польскае панства імкнулася адабраць ад народа і яго чалавечую годнасць, называючы яго «быдлам».

Слаўная наша Чырвоная Армія пайшла на вызваленне нашых братоў — беларусаў і ўкраінцаў. Жудасны цяжар прыгнечання спадае з плеч чалавека. Наш родны, любы брат, аб якім так балела заўсёды сэрца, робіцца шчаслівым і радасным. Народ варочаецца да жыцця.

Ад усёй душы, ад самых лепшых пачуццяў, просіцца слова:

Падзяка і слава вялікай комуністычнай партыі, якая нясыпнна дбае аб шчасці народаў! Слава вялікаму правадыру Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну! Няхай жыве наша слаўная Чырвоная Армія!

Жыві ў шчасці, красуй у радасці вызвалены, вольны народ!

Кузьма ЧОРНЫ.

Да нашых братоў

Нашы замучаныя браты, беларусы, украінцы, яўрэі па той бок спёртай мяжы, прымуць нашы працягнутыя рукі, як увасобленую мару, як дар шчаслівай совецкай зямлі.

Нашы рукі перададуць ім шчасце, заваяванае намі. Мы будзем дзяліць з імі наша шчасце, і ад гэтага яно стане яшчэ большым. І ўсё сваё жыццё з гордасцю і любоўю мы будзем успамінаць гэтыя гістарычныя дні.

Эля КАГАН.

* * *

Няхай жывуць нашы браты!

Дырэкцыя, партарганізацыя, мясцком і калектывы Дзяржаўнай беларускай філармоніі з вялікім хваляваннем, пачуццём захаплення і адданасці сваёй вялікай радзіме заслухалі па радыё паведамленне главы совецкага ўрада тав. В. М. Молатава аб рашэнні совецкага ўрада падаць руку дапамогі прыгнечаным Польшчай беларусам і украінцам. Мы ўпэўнены, што наша родная, магутная, непераможная Чырвоная Армія бліскуча справіцца з задачай, ускладзенай на яе партыяй і ўрадам.

Мы запэўняем нашу партыю і ўрад, што з яшчэ большым энтузіязмам будзем прадаўжаць сваю справу развіцця беларускага мастацтва, аддадзім усе свае сілы, веды і здольнасці, пакажам узоры дысцыпліціраванасці, стойкасці і еднання ў гэты час вялікіх і сур'ёзных падзей. Калі-ж патрэбуецца, мы ўсе з радасцю, як трэба кожнаму совецкаму патрыёту, па першаму закліку партыі і ўрада станем у рады нашай Чырвонай Арміі.

Няхай жыве мудрая палітыка нашай партыі і ўрада!

Няхай жыве вялікі стратэг рэволюцыі, правадыр працоўных усяго свету, наш любімы Сталін!

Няхай жыве бліжэйшы саратнік вялікага Сталіна глава совецкага ўрада таварыш Молатаў!

Няхай жыве наша Чырвоная Армія і яе палкаводзец, першы маршал Совецкага Саюза таварыш Варашылаў!

Няхай жывуць нашы браты—працоўныя Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны!

По даручэнню агульнага схода: ПРАГІН, ШЧЭГЛОЎ, ГІБХІН, РУДНІК, САЛАБУЦІН.

ВЯЛІКАЯ РАДАСЦЬ

Сэрца маё было поўна велізарнай радасцю, калі я слухаў выступленне па радыё старшыні Соўнаркома СССР і наркома замежных спраў Вячаслава Міхайлавіча Молатава.

Спакой і веліч нашай магутнай дзяржавы гучаў у яго словах.

Нашы шматпакутныя, родныя, блізкія і дарагія браты Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны!

Шмат год вы мучыліся разам з намі пад цяжарам царскага самаўладства. Але ні з чым непараўнаны вашы пакуты пад уціскам подлай польскай шляхты. Усё ў вас адабралі, што нельга было адабраць: хлеб, волю, мову. Сэрца і душу з вас вырывалі польскія іезуіты.

Віленскія, гродненскія, беластоцкія рабочыя, аратыя, інтэлігенты!

Шточасна ў нас сэрца абліваласа крывёю, калі мы думалі пра вас.

Даволі пакут! Даволі гора!

Цяпер пад сонцам вялікай совецкай радзімы, пад сонцам вялікай Сталінскай Канстытуцыі вы пазнаеце, што такое сапраўднае шчасце, што значыць чалавеку вольна дыхаць на зямлі.

Ніякі подлы асаднік не будзе цяпер здзеквацца над вамі. Вы атрымаеце зямлю, фабрыкі, заводы, школы. Вы атрымаеце культуру на роднай мове. А якія невычэрпныя магчымасці для развіцця нашай літаратуры і мастацтва з'яўляюцца цяпер! Якія новыя цудоўныя беларускія народныя песні, танцы мы пачуем і пабачым са сцэны Вільна, Гродна, Беластока, Пінска!

Няхай жыве наша родная, непераможная Чырвоная Армія!

Няхай жыве маршал Варашылаў!

Няхай жыве вызваленец пакутуючых мас Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны вялікі Сталін! **Ал. КУЧАР.**

У Белдзяржрамтэатры

Як толькі скончылася выступленне старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР і наркома замежных спраў таварыша В. М. Молатава, якое перадавалася па радыё,—у калектыве Дзяржаўнага Мінскага драматычнага тэатра, які сабраўся на рэпетыцыю, пачаўся мітынг.

З уступным словам выступіла дырэктар тэатра тав. Аллер.

Затым з гарачымі прамовамі выступілі: народны артыст БССР Уладамірскі, заслужаныя артысты БССР Бірыла, Платонаў, артысты Саннікаў, Станюта, Глікман, тт. Гайдарын, Залескі А., якія з пачуццём глыбокай усхваляванасці гаварылі аб вялікай радасці, напоўніўшай іх сэрца, аб тым шчасці, што чакае прыгнечаных польскім фашызмам украінцаў і беларусаў, якіх бярэ пад сваю абарону непераможная Чырвоная Армія.

Тав. Станюта выступіла з прапановай: лічыць сябе мабілізаванымі на абслугоўванне байцоў на перадавых пазіцыях. Калектыў горача падтрымаў гэту прапанову.

У канцы мітынга была прынята рэзалюцыя, ухваляючая палітыку совецкага ўрада.

Ухваляем мудрае рашэнне ўрада

З затоеным дыханнем работнікі Яўрэйскага тэатра БССР сумесна з прызыўнікамі Кагановіцкага раёна слухалі выступленне старшыні Соўнаркома СССР і наркома замежных спраў Вячаслава Міхайлавіча Молатава. Словы аб тым, што совецкі ўрад вынес рашэнне дапамагчы нашым братам у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне і аддаў загад Чырвонай Арміі перайсці граніцу і ўзяць пад абарону беларусаў і украінцаў Захада, былі сустрэты аднадушным ухваленнем.

Адразу-ж пасля выступлення таварыша Молатава работнікі тэатра сумесна з прызыўнікамі Кагановіцкага раёна наладзілі мітынг, каб выразіць свае пачуцці бязмежнай радасці, пачуцці бязмежнай гордасці за наш выдатны совецкі народ, за нашу доблесную Чырвоную Армію.

Усе выступаўшыя заявілі, што калектыў у сваёй творчай рабоце праявіць паўнейшую арганізаванасць, удзесяцярону актыўнасць на карысць нашай соцыялістычнай радзімы. **М. КАГАН.**

ВАНДА ВАСІЛЕЎСКАЯ

ЗЯМЛЯ У ЯРМЕ

Урывак з аповесці

Даўно ўжо хадзілі цёмныя чуткі, людзі гаварылі пра гэта, але ўсур'ёз ніхто не даваў веры. Тым больш, што ўсе былі цяпер напалоханы, кожная бабская плётка ішла далёка і бунтавала народ. Дзецям здаваліся на лябярэжных лугах ваўкалакі, і бабы заўзята кляліся, што таксама бачылі іх. Дзіўнае рабілася—гэта праўда: хто задушыў курыцу ў Ройекаў і раскідаў пер'е па ўсяму двару? Гэта не сабака і не ліса, бабы ведалі гэта напэўна. Пасярод белага дня хадзіў нячысцік за парканамі, па начах крычаў у палях, мециў дзверы хат чорным пальцам—і раніцай ужо хто-небудзь захворваў.

Хадзілі чуткі, неправдападобныя, народжаныя страхам і роспаччу, пераўвялічаныя, скажоныя. Казалі, нібы памёр той ці другі, а гадзіны праз дзве ён, здаровенькі, ішоў па вёсцы, — гэтага ніхто не мог адмаўляць.

Так і з гэтай справай: плялі людзі розныя небыліцы, але за праўду ніхто іх не лічыў.

Нарэшце, аднаго разу старшыня прыехаў з горада, ні з кім не гаворачы, кінуўся ў хаце на ложак і ляжаў пластом, а старшыніха хадзіла каля яго на дыбачках. І не прайшло яшчэ за поўдзень, як забрахалі сабакі і ляснічы Омярэк прайшоў па вёсцы, абвяшчаючы:

— Загадана забраць чаўны з возера! Калі чый застанецца да раніцы, патаплю!

— Што-ж гэта такое? Па якому праву?—дзёрзка выступіў наперад Стасяк.

— Граф заарандаваў усе водныя прасторы,—па-вучонаму растлумачваў ляснічы.

— Азёры і сажалкі?

— Вясковую ваду?

— Пытаўся ён згоды ў воласці?

— Дазволіў яму сход?

— Не інакш, як са старшынёю згаварыўся! А ну, да старшыні!

Уміг сабраўся натоўп. Поўна набралася народа ў абодвы пакоі старшыні, у сені, згрудзіліся перад домам.

— Што гэта за парадкі такія, старшыня? Прышоў ляснічы і патрабуе, каб забралі чаўны з возера...

— Палова возера наша, вясковая...

— Спакон веку так было...

Старшыня бездапаможна развёў рукамі:

— Граф заключыў умову ў старастаце на арэнду Буга.

Усе недаверліва загаварылі:

— Ды хіба гэта можна? Дзе-ж мы будзем рыбу лавіць?

— Вясковыя не мелі ніякага права лавіць рыбу ў Бугу,—заявіў Омярэк.—Усюды за права лоўлі плацяць палову.

— Ды мы заўсёды лавілі!

— А цяпер не будзеце! Гэта было незаконна!

— Незаконна? Вось дык сказаў! Граф, ці што, ваду стварыў? Граф напусціў у яе рыбы? Яго ўласная рыба?

— Пачакайце, мужыкі, — умяшаўся Ройек.—Буг Бугам, а я пытаюся, як будзе цяпер з возерам? Яно-ж вясковае.

Старшыня ўнікаў мужыцкіх позіркаў, утаропіўшыся вачыма ў карычневатыя прожылкі, што выразнымі лініямі выступалі на дошцы стала:

— Ёсць такі закон: хто арандуе раку, таму належаць і залівы.

— Хіба возера—заліў?

— Бач, як павярнулі!

— Які заліў? Крыніцы самі б'юць з-пад зямлі!

— Вядомая справа: ля Радзюкоў вада—халодная, як лёд!

— І ля арэшніка таксама!

— І ля твайго луга, Уладзіслаў!

— Ці ўтрымаецца вада на чатырнаццаць метраў у заліве?

— Што і казаць! Такая глыбіня!..

— Не вам меркаваць. У старастаце графу аддалі ў арэнду Буг ад Калінаў да Остржэня. Адзначылі на карце, што да лябужскіх заліваў належыць возера і тыя сажалкі, што ля леса і за балотам.

— Адзначылі на карце? Хлусня! Не быць гэтаму!

— Мяне гэта не тычыцца,—сказаў Омярэк.—Мая справа — паведаміць, каб да раніцы чаўноў на возеры не было.

І вышаў, парыпваючы лакіраванымі ботамі і новым поясам з глянцавага рэмня. Мужыкі засталіся ў хаце.

— Што-ж рабіць нам цяпер?

Старшыня зноў развёў рукамі:

— Можна напісаць заяву. Але нічога з гэтага не будзе, адна цаганіна. Я ездзіў сёння ў горад, даведаўся.

— Значыць, прыдзецца ўсім нам з голаду паміраць?

— Табе, Юзэф, не прыдзецца: у цябе без малага дзесяць моргаў зямлі.

— А Ройекі? А Захарчукі? А Стасякі? А Ігнахі? А ўсе, што жывуць на тым баку, на гары?

— Людзі добрыя, калі ён заарандаваў ваду, дык цяпер у яе кроку не ступіш!—у роспачы ўзвыла Ройечыха, што даведалася аб падзеях і прыбегла следам за мужам.—Будзе, як з лесам, што за ягадку, за грыб прыстрэльваюць чалавека! Не дазволяць нам цяпер лезці ў ваду за ракушкамі. Заб'юць, як забілі Зелінскага!

— Шчырая праўда!

— Не адны Ройекі, Захарчукі, Стасякі, а ўсе мы падохнем...

— Бясплодным пяском праклаў бог гэтую зямлю, адну ваду даў, каб маглі жыць людзі...

— Лавіць рыбу і карміць ракушкамі свіней...

— Значыць свінням таксама канец прыходзіць...

— Пяском будзем цяпер затыкаць дзецям глоткі...

— Відаць, граф затубіць нас цяпер да рэшты...

—Торбу за плечы—і па свету!

З поля адна за другой прыбягалі бабы, крычалі, прычыталі, вылі, але мужыкі не ўціхамірвалі іх. Што было рабіць? Ва ўсіх уходзіла глеба з-пад ног.

— Старшыня павінен параіць што-небудзь...

— Можа ён сам з графам знюхаўся...

— Хто плату за кароў спаганяў, што не належала?

— Пакуль не выбралі яго, салодкі быў, як мёд, а цяпер толькі і ведае, што ў горад ды на пост скакаць...

— Вялікі чыноўнік страшыць баб графамі, а як спатрэбіцца што, дык яго і следу няма.

Старшыня падняў руку:

— Сяляне, крыкам мы нічога не зробім. Я напішу заяву і заўтра павязу ў горад...

— Тут толькі адно дапаможа...—хмурна, злавесным голасам сказаў Захарчук.

Настала цішыня.

— Кажы, што?

— Або мы, або ён...

— Правільна гаворыць!—закрычала Баніха і следам за ёю бабы ўзнялі дзікі гармідар:

— Што нам яшчэ чакаць? Чаго ўхіляцца? Айда ў Остржэнь!

— У Остржэнь!

З крыкамі, з грукатам рынулі да дзвярэй. Гарачым полымем веяла ад распаленых твараў. Сабакі завізжалі і завылі. Усе, хто быў жывы, выскаквалі з хат. Старшыня выбег на дарогу бледны, з трасучыміся рукамі. Напралом, задамі, кінуўся да Ройекаў, да Вінцэнта:

— Трэба спыніць іх, бо будзе няшчасце!

Вінцэнт у замяшанні шукаў шапку, бездапаможна кідаўся па пакою. Тым часам вестка разнеслася ўжо па ўсіх хатах. Ігнаціха выбегла ў двор з дзіцёнкам на руках і павалілася на зямлю ля кучы гною:

— А божухна, ды мы з голаду падохнем, вясны не дачакаем!

— Няхай маланка заб'е яго за ненасытную глотку, за нашу крыўду, за нашу нядолю.

Плач баб і прычытанні разносіліся па дварах, па агародах, па дарозе. Ігнаціха рашуча ўскочыла, загарнула дзіцёнка ў шаль:

— Ісці, дык ісці!

Бабы спрабавалі зацягнуць малітвенную песню. Колькі часу яна калыхалася над дарогай штохвіліны абрываючыся:

— Літаслівая маці, заступніца!..

На павароце, ля недабудаванай школы, дарогу натоўпу перасеклі стараста і настаўнік:

— Людзі добрыя, што вы робіце? Апамятайцеся!

— Можна як-небудзь уладзіць справу...—хрыплым голасам спрабаваў угаварваць Вінцэнт.

— Вы абавязаны ісці з намі, з мужыкамі, а не супроць нас!—проста ў твар яму выкрыкнуў Ройек.

— Хто жывы, хай ідзе разам з вёскай, а калі не — вон з вёскі!

— У Остржэнь!

Па дарозе беглі запазнаўшыя, далучаючыся да натоўпу. Хмары пылу ішлі з дарогі, далёка разносіўся гоман.

Вінцэнт стаяў нібы скамянелы.

— Не мінаваць бяды...—сказаў старшыня. Губы ў яго трэсліся. Ён пацягнуў настаўніка за рукаў:

— Хадзем, нам няма чаго тут рабіць.

Яны павярнулі ў апусцелую вёску. Зялі шырока расчыненыя дзверы хат. З мужчын не засталося амаль нікога—хіба толькі старыя ды хворыя. Нехапала і шмат жанчын. Дзеці рассыпаліся па дарозе і гучна плакалі, не разумеючы, у чым справа. З янозічава хлява выйшлі на дарогу дзве свінні і капалі, высока падкідваючы, пясок. Устрывожаныя нядаўнім гоманам сабакі рваліся з ланцугоў і поўнілі паветра дзікім выццём.

— Праз гадзіну-дзве яны будуць ужо ў маёнтку,—сказаў старшыня.

Мароз прабег па спіне Вінцэнта.

— Гэта немагчыма... Трэба нешта рабіць...

Старшыня пацiснуў плячыма:

— Цяпер ужо нічога не зробіш. Паеду на пост, заяўлю... Няхай прышлюць салдат...

Чэснай і самаадданай працай на сваім пасту акажам дапамогу Чырвонай Арміі

ЗАХОДНІМ БЕЛАРУСАМ

Палілі вас агнём, знішчалі вас мячом,
Не смелі гаварыць вы моваю свaёй,
Вы плакалі крывёй пад панскім бізуном,
За вас хварэлі мы і сэрцам і душой.

Даволі слухаць больш пакутны спеў бароў,
За волю вы пашлі для любых ніў і сёл...
І беламу арлу, што падае на дол,
Ніколі не ўзняць драпежных кіпцюроў.

Даволі мучыў вас праклятты польскі кат,
Руку братэрскую прымі, таварыш, родны брат!
Хай згіне польскі пан! Прабіў рашучы час!
Чырвоны, вольны сцяг навек з'еднае нас!

Заходні беларус! Ты вышаў грамадой,
Каб з намі паеднаць любімыя палі.
Бо мы адной сям'і, бо мы адной зямлі,
Нам з нашай маткай жыць — чырвонаю Масквой!

Пятрусь БРОЎКА.

Пісьмо дамоў

Дзень добры, вызвалены край мой! Прывітанне вам, браты і сёстры, учарайшыя рабы і вольныя грамадзяне цяпер!

Дваццаць пяць год я вас не бачыў, але ніколі я не забываў аб вас і аб нашым мястэчку, якое дваццаць год стагнала пад цяжкім ботам польскага пана і капрала. Калі вы жывы і здолелі ўстаяць супроць голада, нэндзы, здзекаў — прывітайце цёплым словам мяне на вашым свяце.

Мой вялікі і магутны савецкі народ радуецца вашай радасцю, а разам з ім і я. Які велічны, светлы дзень, — дзень 17 верасня!

Мілыя мае мястэчкоўцы! Смаргонскія гарбарнікі, ракаўскія механікі, гарадоцкія шапавалы, дарагія мае настаўнікі! Вы навучалі мяне бязмежнай любві к народу і яго творчасці. У вас вучыўся я здаровай, шматкрасачнай, гучнай мове яўрэйскай народнай масы.

Прывітанне вам, дарагія браты!

Вас абараняе магутная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія. Будзьце спакойны за ваша будучае. І мы ўсе, вашы браты, насільна адлучаныя ад вас польскай шляхтай, сёння працягваем вам сяброўскую руку. За вас наш народ, наша партыя, наш Сталін.

Няхай жыве наша комуністычная партыя!

Няхай жыве непераможная Чырвоная Армія!

Няхай жыве наш правадыр і настаўнік Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

* *
*

Прывітанне вам ад усіх вашых землякоў. Вы напэўна не забыліся Хаву-Геню, работніцу друкарні, забітую і заплаканую жанчыну. І вось Велвл — адзін з яе хлопчыкаў, вырасшых у гразі і пыле ракаўскіх завулкаў, зрабіўся ў нас у Мінску інжынерам! Ён будуе дарогі на Далёкім Усходзе. А Лёля Сталавіцкі — ён таксама інжынер-тэхнолаг, дацэнт Харкаўскага тэхналагічнага інстытута. І яшчэ шмат, шмат дактароў, інжынераў, прафесараў вырасла з дзяцей вашых сёстраў і братоў. А я, каторы пішу вам гэтыя радкі, стаў савецкім пісьменнікам.

Уры ФІНКЕЛЬ.

Братам Заходняй Беларусі

Браты Заходняй Беларусі!
Дзень вызвалення ваш настаў.
К свабодзе век народ імкнуўся
І путы ржавыя парваў.
З крыві, касцей людзей радзімых,
Расла ў палях палын-трава.
Быў смуцен Нёман наш гуллівы,
Ён злосць кіпучую хаваў.
Яна праллецца на загонах
Жывучай павадкай навек
І змые ворагаў шалёных,
Каб век быў вольны чалавек.
Ідзіце к сталінскім народам,
Дзе дружба слаўная жыве!
Браты, браты! К шчаслівым годам
Сям'я народаў вас заве.

Г. НЯХАЙ.

Слава Сталіну!

Мудрае рашэнне нашага ўрада падаць руку братняй дапамогі прыгнечаным беларусам і ўкраінцам захапляе ўвесь наш народ.

Я з хваляваннем сачу за кожным крокам прасоўвання Чырвонай Арміі на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Як прыемна чытаць кароткія, але бязмежна светлыя радкі аб гарачай сустрэчы байцоў радзімы соцыялізма братамі нашымі — беларусамі і ўкраінцамі, якія дваццаць год пакутвалі ў фашыецкай Польшчы.

Слава Сталіну — бацьку нашаму!

Слава Арміі Чырвонай!

Слава вызваленым беларусам і ўкраінцам!

Засл. дзеяч мастацтваў
БЕМБЕЛЬ А. О.

Слава!

Браты і таварышы з Заходняй Беларусі і Украіны! Сёння мы прыходзім к вам, вызваленым з-пад ярма шматгадовай несправядлівасці, каб даць вам шчасце і свабоду. У нас аднолькавыя імёны, у нас адна зямля, над намі адно прасторнае неба. Цяпер к навек беламу арлу не распрасцерці ў ім сваіх змрочных крылляў. Узнесены магутнай рукой савецкага чырвонаармейца, вечна будзе лунаць над вамі непераможны сцяг свабоднага народа.

Чырвонай Арміі навекі вякоў слава, слава, слава!

Г. БЯРОЗКІН.

Пагранічны слуп выкапан

Простыя словы не могуць перадаць гэтую радасць, — наша слаўная Чырвоная Армія перайшла граніцу.—Беларусь і Украіна не будуць больш разарванымі на дзве часткі — на ўсход і захад. Польскія паны здзекваліся над беларускім і ўкраінскім народамі, — яны ім не далі ніякіх правоў, ніякай свабоды, ніякіх магчымасцей для мінімальнага чалавечага існавання. Пад ярмом польскай шляхты стагналі беларускі і ўкраінскі народы.

Свабодны савецкі народ не мог пакінуць сваіх братоў на знішчэнне і рабаванне, і вось пагранічны слуп выкапан. Не вёрсты нас аддзялялі ад нашых родных братоў і прыяцеляў, а годы. На гэтым баку граніцы над намі ззяла сонца, якое нам прынеслі Ленін і Сталін, на тым баку распрасціраліся крыллі драпежнага арла, якія засланялі ад працоўных сонца.

Сумесна з беларусамі і ўкраінцамі жывуць на захадзе дзесяткі і сотні тысяч яўрэяў. Але толькі ў Савецкім Саюзе ўсе народы роўны. Сумесна з беларускім і ўкраінскім народамі, якія жывуць на Захадзе, стануць яўрэі Захада свабоднымі грамадзянамі.

Вызваленыя, прывітанне вам! Прыходзьце, будуйце, жывіце разам з намі і будзьце шчаслівы так, як мы!

М. ЛІЎШЫЦ.

Вялікі дзень

Змоўкла радыё, і людзі з усмешкамі радасці на вуснах, з слязамі радасці на вачах абыймалі і цалавалі адзін аднаго, вітаючы з мудрай пастановай свайго ўрада, выказаўшага патаемныя жаданні і волю народа.

І туды, дзе адарваная крывавымі кіпцюрамі белага арла непадзельная частка Беларусі і Украіны стагнала ад гвалту і здзеку,—туды паляцелі чырвоныя сокалы, пакрочылі чырвоныя волаты.

Яны вырылі з зямлі слупы несправядлівага рубяжа, які аддзяляў маці ад сына, брата ад сястры і дзяцей ад бацькоў, яны шпурлялі гэтыя слупы на плечы свае багатырскія і сказалі:

—Мы паставім іх там, дзе скончыцца абшар, на якім жывуць нашы кроўныя, —паставім іх там, дзе нам загадае наш правадыр.

Загула зямля і паветра ад лёту чырвоных сокалаў, ад хады чырвоных волатаў,—гэта рушыла першае і адзінае ў свеце войска, якое нясе не агонь і меч, не разор і знішчэнне, але мір і свабоду. Гэта ідзе сіла непераможная ратаваць братоў сваіх ад разору, ад гвалту—знішчэння.

Дзень гэты вялікі, калі наш савецкі народ працягнуў руку дапамогі кроўным братам сваім, — дзень гэты залатымі літарамі высячэм мы на мармуры гісторыі і словамі моцнымі, як граніт, і звонкімі, як срэбра, раскажам аб ім, каб усюль ухвалялі наш слаўны урад, наша войска Чырвонае і друга працоўных сусвету вялікага мудрага Сталіна.

М. ІЛЬІНСКІ.

ПРЫВІТАННЕ ВАМ, ВЫЗВАЛЕНЫЯ БРАТЫ!

Час надышоў. Магутная Чырвоная Армія вызваляе нашых братоў з Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Ішлі годы, і ніколі, ніколі мы не пераставалі марыць аб гэтым дні вызвалення. І вось вы вызвалены. На нашых непераможных штыках мы вам прынеслі мір.


Дарагія таварышы!

Пройдуць годы, і раны на вашым целе зажывуць! Ваша спустошаная зямля наллецца новымі сокамі, і сталінскае багацце перапоўніць вызвалены край.

Цяпер ваша жыццё ўступае ў свае ўласныя правы.

Прывітанне вам, вызваленыя браты!

Г. КАМЯНЕЦКІ.



ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ПРЫЗЫВА Ў РСЧА Ў ГОРАДЗЕ МІНСКУ. Прызыўнікі Кагановіцкага раёна — работнікі «Белпромбудтрэста». Злева направа: тт. **Вергейчык С. М.** — інспектар па разліках, **Бельчэнка С. Н.** — возчык, **Крук М. Е.** — цесляр, **Драздоў Т. М.** — слесар,—залічаныя ў рады РСЧА.

Фота Б. А. Вернера (Фотахроніка БЕЛТА).

Горача вітаем беларусаў і ўкраінцаў

Мастакі і работнікі камбіната выяўленчага мастацтва Савецкай Беларусі, заслухаўшы выступленне па радыё старшыні Совета Народных Камісараў і народнага камісара па замежных справах Саюза Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік таварыша Молатава, з усхваляванай радасцю вітаюць гістарычнае і выключна гуманнае рашэнне савецкага ўрада—падаць руку дапамогі беларускаму і ўкраінскаму народам, якія былі прыгнечаны польскімі панамі і ваеншчынай.

Беларускія мастакі і работнікі камбіната выяўленчага мастацтва горача вітаюць вызваленых беларусаў і ўкраінцаў.

Браты беларусы і ўкраінцы! Мы радуемся разам з вамі, што раз'яднаныя раней чорнай сілай на дзве часткі Беларусь і Украіна зараз у моцным братнім саюзе. Пад кіраўніцтвам партыі вялікага Леніна і яго геніяльнага прадаўжацеля, роднага бацькі і друга беларускага і ўкраінскага народаў таварыша Сталіна, мы разам з усімі вызваленымі народамі будзем будаваць квітнеючую, аб'яднаную Савецкую Беларусь і Савецкую Украіну ў адзінай вялікай сям'і народаў Савецкага Саюза.

Мы, мастакі і работнікі выяўленчага мастацтва Савецкай Беларусі, па першаму закліку рабоча-сялянскага ўрада гатовы змяніць палітры, кісці і разцы на зброю перамогі і разам з байцамі Чырвонай Арміі біць ворага на той тэрыторыі, адкуль ён паспрабуе на нас напасці.

А. ГРУБЕ.
Старшыня Саюза савецкіх мастакоў БССР.

Хутка сустрэнемся

Хвалюе і да глыбіні сэрца радуе мяне, як і ўвесь савецкі народ, гістарычнае рашэнне савецкага ўрада — злучыць народы, якія былі на працягу дваццаці год раз'яднаны.

Я ўяўляю той радасны дзень, калі сустрэнуцца браты і сёстры. Шчаслівыя беларускі і ўкраінскі народы абдымуць сваіх родных братоў, у якіх былі сагнуты спіны ад невыноснага прыгнёту польскіх паноў-катаў. Я, як скульптар, адчуваю сваю сустрэчу з народнымі мастакамі і скульптарамі вызваленага беларускага народа. Гэта будзе такая сустрэча, якая можа быць толькі паміж роднымі братамі, якія прымусова былі разлучаны.

Гэта сустрэча выкліча яшчэ большы ўздым нашай творчасці. На плошчах, на вуліцах вызваленай Беларусі мы разам з вамі паставім манументальныя скульптурныя творы беларускага і братніх народаў Савецкага Саюза. Гэтыя скульптуры будуць адлюстроўваць перамогу і ўрачыстасць народнага шчасця, якое дала нам партыя Леніна—Сталіна.

Горача віншую вас і моцна цісну вашы рукі. Хутка сустрэнемся.

Заір АЗГУР.
Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР.

МАЕ МАРЫ ЗБЫЛІСЯ

Вялікі паход у імя вызвалення з-пад ярма панскага прыгнечання, здзекаў, голаду і фізічнага знішчэння, у імя свабоды і шчасця прыгнечаных нашых братоў — беларусаў і ўкраінцаў з'яўляецца першым такім паходам у гісторыі развіцця чалавецтва. Наш урад, наша вялікая комуністычная партыя і геніяльны правадыр працоўнага чалавецтва таварыш Сталін адгукнуліся на тое, чым білася сэрца вялікага савецкага народа, яны здзейснілі мары нашага народа і далі нашым братам магчымасць стварыць свабоднае, радаснае і шчаслівае жыццё, без вечнага страху перад куляй польскага жандара ці галоднай смерцю.

Мяне, работніка беларускага тэатра, які дваццаць тры годы свайго жыцця адаў справе развіцця беларускага тэатральнага мастацтва, дваццаць год займалі мары паказаць сваё мастацтва маім братам — заходнім беларусам, даць ім магчымасць свабодна слухаць сваю родную мову, якая забаранялася. Мае мары збыліся.

Я змагу паказаць маім вызваленым братам вобразы савецкіх людзей, я змагу паказаць шчаслівае, заможнае і культурнае жыццё нашага калгасніка, я змагу паказаць, як змянілася псіхіка савецкага чалавека, я змагу паказаць усю паўнату, багацце і культурны ўзровень маёй соцыялістычнай радзімы.

І тады майму вызваленаму брату-беларусу стане ясна, якім прыгожым жыццём жыве пры соцыялізме мой народ.

К. САННІКАЎ
Рэжысёр Мінскага Белдзярждрамтэатра.

БРАТУ-БЕЛАРУСУ

Сухімі прагнымі вачамі
У славесна-мёртвай цішыні
Ты з тога берага начамі
Глядзеў на нашыя агні.

Жнучы счарнелы радкі колас,
Паліты потам і крывёй,
Ты слухаў вольнай песні голас
Над нашай нівай залатой.

Так дваццаць год адзінай марай
З табой упарта мы жылі,
Каб у адно злучыць абшары
Спрадвек адзінае зямлі.

Прышла чаканая часіна
Здзяйснення мар! Знікае жах.
У Львове, ў Пінску ўжо асіны
Даўно сумуюць па панах.

Разносьце-ж, ветры, грозны гоман,
Змятайце след бяды-тугі.
Шумі, бурлі, наш родны Нёман,
Тапі няволі берагі!

Дык дай руку мой брат заходні
Адчуўшы крыллі за спіной.
Збавення радаснай пахоняй
Палаюць зоры над Масквой.

АЛЕСЬ ЖАЎРУК.

Добры дзень нашым братам!

Міжнародныя падзеі апошніх дзён няўхільна вялі нас к таму адзіна правільнаму рашэнню, якое прыняў савецкі ўрад, рушыўшы Чырвоную Армію на абарону ні ў чым непавінных братоў нашых, працоўных беларусаў, украінцаў, змардаваных польскімі фашысцкімі каланізатарамі.

Польскіх паноў нічаму не навучыла гісторыя. Польскія паны былі часта біты за свой пусты, але пятушыны, шляхецкі гонар, за сваю паланізатарскую палітыку, за сваё бесчалавечнае прыгнятальніцтва малых народаў. Польскі ўрад давёў свой народ да поўнага спусташэння і разгрому і збег, як кучка прагарэўшых халтуршчыкаў-камедыянтаў, калі навісла небяспека над Польшчай.

Палітыка савецкага ўрада выклікае не толькі наша, але і сусветнае захапленне. Гэта палітыка яснага розуму, цвёрдай волі і найвялікшай гуманнасці.

Усе прыгнечаныя народы свету з надзеяй глядзяць на Савецкі Саюз.

Нашы родныя браты-беларусы з сардэчнай гасціннасцю сустракаюць чырвоных байцоў, якія нясуць мір і абарону іх жыццю і іх хатам.

Слава Сталіну, вялікаму правадыру народаў!

Слава яго мудрым саратнікам!

Ура нашым байцам Чырвонай Арміі, якія не ведаюць паражэння!

Добры дзень нашым братам-беларусам!

Е. РАМАНОВІЧ.

НУПРЭЙКА

(НАРЫС)

Нупрэйка жыў на тым баку савецка-польскай граніцы. Часта ўлетку ён аглядаў ваколіцу з саламянай страхі бацькавай хаты. Прыляжа, прытуліцца да старой спарахнелай саломы і глядзіць-глядзіць. Вострым вокам тарапіцца, узіраецца ў большавіцкую зямлю. Пазірае на той бок слупоў, на той бок рэчкі.

Луг, хмызняк, поле, вялізныя будынкі калгаса «Чырвоная варта», малады сад, які цягнецца на шмат гектараў,—усё гэта вабіць да сябе дзесяцігадовага хлопчыка.

Часта Нупрэйка глядзеў на той бок.

На абшырным полі, яшчэ большым, чым у пана Мастоўскага, злога асадніка, які прыехаў сюды з Пазнані ў 1921 годзе, паўзе часам нешта вялізнае, аграмаднае і пыхкае дымам. Над аграмадзінай палыхае чырвоны сцяжок.

—Што гэта?—пытаўся Нупрэйка ў бацькі.

— Машына,—растлумачыў бацька. — Зямлю арэ. Трактарам завецца. Унь, бачыш, чалавек кіруе машынай..

Нупрэйка бачыць кожны раз з саламянай страхі, што там, дзе праходзіць трактар, чарнее зямля.

Нупрэйка не зводзіць вачэй з цудоўнай машыны.

Нупрэйка пачуў аднаго разу крыкі вясковых:

— Уцякайце, хавайцеся!

Ён азірнуўся. У вёску едуць конныя— некалькі жаўнераў і адзін у чорным плашчы, якім укрывае і крыж каня. Гэта пан Мастоўскі — люты асаднік. Зноў, відаць, сухастойку ў яго лесе высеклі. Зноў катаваць будуць народ. Зараз пачнецца лямант.

Нупрэйка ссоўваецца спрытна ўніз з саламянай страхі. Яго бярэ зайздрасць: ад нас у бок «Чырвонай варты» вецер нясе заўсёды плач, а адтуль да нас — вясёлыя песні. І Нупрэйка пытаецца часта ў бацькі:

— Чаму, тата, мы не жывём там?

— Дзе гэта «там»? — нібы не разумее бацька.

— У «Чырвонай варце».

— А-а-а, які-ж ты ў мяне зух! Будзе некалі і тэта. Толькі трымайся! Маўчы...

У касавіцу большавіцкія касцы з «Чырвонай варты» падыходзяць да самай граніцы. Тады бацька Нупрэйкі таксама хадзіў блізка сюды касіць з польскага боку. І Нупрэйка тут-жа з граблямі.

— Тата! Вось яны! Блізютка...

Бацька пільна ўзіраўся.

Касіў там дзядок з сіўенькай барodкай. Бацька не зводзіць вачэй з таго дзядка і кліча да сябе Нупрэйку.

— Бачыш, сынку, таго сівенькага? Унь там, у белай кашулі, у чорных гарадскіх нагавіцах, і ён на нас глядзіць. Унь, далонню вочы ад сонца засланяе.

— Бачу, бачу! — узрадваўся Нупрэйка.

— Гэта мой бацька... Твой дзед. Прануком завецца.

Ад хвалявання дрыжыць голас бацькі.

— Пазнае мяне стары, — шэпча бацька і прыціскае да сябе Нупрэйку.

Нупрэйка крыкнуў:

—Дзя-дo-о-о-ок! Падыходзь бліжэй.

Дзед пільней углядаецца. Яго сівая бародка здаецца шматком воўны.

На крык Нупрэйкі бяжыць да іх злосны жаўнер.

А вось аднаго разу ўночы бацька Нупрэйкі падышоў да хлопчыка вельмі ўстрывожаны. Паклікаў сына на гумно і сказаў:

— Зараз пойдзеш, сынок, на той бок граніцы. Не будзеш баяцца?

— Не! — узрадваўся Нупрэйка і вочы яго заблішчэлі.

Бацька пяшчотна пагладзіў Нупрэйку па галаве грубай запрацаванай рукой.

— Дык вось, сынок. Хмызняком пойдзеш. Асцярожненька. А па голым полі ціханька прапаўзеш. Ніхто цябе не заўважыць. Першаму чырвонаармейцу, якога сустрэнеш на граніцы, скажы, што ў гэту ноч тры польскія шпіёны павінны каля нас перайсці граніцу.

— Добра, татка, пайду!

— Толькі глядзі, сынку. Да раніцы ты павінен быць тут. А то як астанешся там, — мяне загубіш, і матку, і малых...

— Добра, татка!

Была цёмная дажджлівая ноч. Нупрэйка пайшоў. З сваім заданнем ён справіўся вельмі ўдала. Раніцой ён быў ужо дома. Пагранічнік давёў яго назад да самай мяжы пасля таго, як шпіёны былі злоўлены.

* *
*

Калгас «Чырвоная варта» знаходзіцца блізка ад граніцы. Калі глянеш з пагорка, дык суседняя вёска на баку панскай Польшчы відна, як на далоні. Часта на фоне неба вызначаюцца араты ды іх хударлявыя конікі. Можна заўважыць, як напружваецца з усіх сіл схуданы конік, як ён выцягваецца і валачэ старадаўнюю сялянскую саху... Напружваецца і араты. Ён бязлітасна сцёбае пугай знясіленую жывёліну.

Калгаснікі «Чырвонай варты» бачаць і фальварак асадніка Мастоўскага, і вялікую сажалку. Фальварак дае пану Мастоўскаму мала прыбытку. І вось, жывучы каля самай мяжы з намі, ён задумаў таксама займацца «будаўніцтвам». Парабкі і навакольныя сяляне прачысцілі старую сажалку. Пан Мастоўскі пусціў туды «залатых рыбак».

Аднаго разу з боку «залатых рыбак» пачулася галашэнне. Пан Мастоўскі злавіў каля сажалкі хлапчука з вудачкай. Ён укінуў малога ў глыбокую сажалку.

А калі хлапчук пачаў плысці да другога берага, пан Мастоўскі закідаў яго каменнямі. Хлопчык апусціўся на дно, а над ім усплылі чырвоныя плямы крыві, якія хутка размыліся ў вадзе.

Хлапчук загінуў.

Матчына галашэнне чутно было некалькі дзён:

А мой ты Нупрэйка..
А мой ты залаценькі...
А мой ты родненькі...
Люты пан цябе ўтапіў.
Каменнямі галоўку разбіў.
Каб так пан Мастоўскі ляжаў.
Каб так, як мой сынок, маўчаў...

Усё чутно было ў нас — слова ў слова. З боку «залатых рыбак» плылі да нас матчыны скаргі і каламуцілі нашу калгасную радасць.

Жаласлівыя калгасніцы выцiралі вочы кончыкамі каляровых хустак. Мужчыны былі пахмурныя і гнеўныя.

А калгасны конюх, дзед Нупрэйкін — Пранук, узняў рукі і абодвума кулакамі трос у бок фальварка пана Мастоўскага і крычаў гнеўным голасам:

— Мы яшчэ прыдзем за вас і заплацім панам за ўсе крыўды!

Стары Пранук дажыў да гэтага шчаслівага часу.

З. БЯДУЛЯ.



Павільён СССР на Міжнароднай выстаўцы ў Нью-Ёрку. На здымку: гарэльеф Беларускай ССР—работа скульптара М. Балашова.

ПРАЗ ДВАЦЦАЦЬ ГОД

Дваццаць год былі разлучаны жыццёвымі нягодамі два родныя браты-беларусы. Дваццаць год жылі яны поруч і ў той-жа час далёка адзін ад аднаго.

Старэйшы брат на ўсходзе разжыўся, разбагацеў. Свяціла яснае сонца яму і яго прыяцелям-суседзям. Суседзі памагалі яму, а ён ім. Хата ў яго стала радаснаю і віднаю. Плады сваёй працы спажываў ён сам. Абуўся і апрануўся старэйшы брат па-людску, узяў у рукі машыну і прымусіў яе служыць сабе. Добра і весела было яму жыць, але нудзіўся ён па сваім малодшым брату, які жыў, здаецца, гэтак блізка, а сапраўды далёка.

Далёка жыў малодшы брат. Глянуць старэйшаму на захад, дык, здаецца і відзён той сумны край, дзе стаіць братава хата, а каб ісці, дык дзесяткі год патрэбны малодшаму, каб дайсці да старэйшага.

Не пашанцавала малодшаму, дый не па сваёй віне астаўся ён там, дзе астаўся. Ніколі не бачыў ён прасвету над сваёй галавою, ніколі не заглядвала ў акенца яго хаткі яснае сонца. Не было ў яго дружных прыяцеляў-суседзяў, а жыў ён парабкам пры неразумным гаспадары. Ведаў той гаспадар толькі адно, каб прапавалі яго парабкі дзень і ноч, каб не згулялі ніколі, каб не ўзгіналіся ад цяжкое працы на яго. Цяжка працаваў малодшы брат, а ні разу не мог сабраць больш, як на лапці. Старая світка была яму апранахай і на будзень і на святдзень. Не пашанцавала малодшаму брату.

Як на свята, ішоў на работу старэйшы брат і меў сабе і добраму госцю і чарку і да чаркі. А па працы чутны з яго хаты і спевы і музыкі. Не блага жыў старэйшы брат.

Малодшы брат таксама ведаў спевы, гэта былі яго стогны пры цяжкай працы на свайго гаспадара. Ведаў ён і што такое музыка,—як паміралі яго дзеці з недаедзі, з холаду, тады званілі ў капліцы і хаўтурны звон быў яму за музыку. А чарка... Горка і п'яна было яму без чаркі—ён піў свае бядачыя слёзы.

Так жылі браты. І хацелася ім угледзецца, угледзецца, каб больш не разыходзіцца і жыць у бацькоўскай хаце разам.

Добрых, дружных прыяцеляў-суседзяў меў старэйшы брат. І от кажа самы старэйшы, самы шаноўны, самы дружны, самы знатны сусед старэйшаму брату:

— Дарагі мой і добры мой прыяцель-беларус! Катарга, а не жыццё твайму малодшаму брату. Рабаваў-рабаваў неразумны гаспадар яго, а цяпер аддае на далейшую здзеку іншым гаспадарам. Баліць маё сэрца, гледзячы, як пакутуе твой брат. Бо твой брат і мне брат. Працягнем-жа яму братнюю руку дапамогі і вызвалім яго з гэтае катаргі. Хай зазнае і ён волі і шчасця.

І працягнулася братняя рука малодшаму брату, — шырокая, дружная, мускулістая рука.

Давай абнімемся, занядбаны малодшы брат наш, і пацалуемся моцна пасля доўгае разлукі.

На двары залатая восень. Гэтая восень стане вясною твайго шчасця.

Сёнешні дзень увойдзе ў скрыжалі нашае гісторыі як самы радасны і самы хвалюючы дзень.

Пацалуемся-ж браце!

Р. МУРАШКА.

СЭРЦА ПОЎНІЦЦА ШЧАСЦЕМ І РАДАСЦЮ


Прамова тав. Молатава напоўніла маё сэрца шчасцем і радасцю.

Прышоў доўгачаканы час вызвалення нашых родных братоў украінцаў і беларусаў з-пад панскага прыгнёту і сваволля.

Браты нашы родныя! Вашы пакуты кончыліся назаўсёды. Комуністычная партыя і вялікі Сталін адкрылі перад вамі шлях да светлага соцыялістычнага жыцця.

М. МОДЭЛЬ.

РАСТУЦЬ ГАРАДЫ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ



Пакажам роскві соцыялістычнага мастацтва

Мы, работнікі Беларускага тэатра оперы і балета, гарым жаданнем магчыма хутчэй паказаць нашым заходнім братам — беларусам і украінцам роскві беларускага совецкага мастацтва, любоўна ўзрошчанага комуністычнай партыяй і яе геніяльным правадыром, бацькам працоўнага чалавецтва таварышам Сталіным.

Няхай жывуць нашы браты—працоўныя Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны!

Няхай жыве авеяная славай Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія на чале з маршалам Совецкага Саюза таварышам Варашылавым!

Няхай жыве совецкі ўрад на чале з яго кіраўніком Вячаславам Міхайлавічам Молатавым!

Няхай жыве комуністычная партыя і яе правадыр—геній чалавецтва таварыш Сталін!

Дырэктар тэатра **Гантман**, народная артыстка БССР **Александроўская**, заслужаныя артысты БССР: **Дзянісаў, Балоцін, Мурамцаў, Аляксеева, Млодзік**, галоўны дырыжор ордэнаносец **Грубін**, заслужаныя артысты БССР: **Нікалаева, Васільева**, заслужаны артыст РСФСР ордэнаносец **Ермалаеў**, салісты оперы: **Друкер, Лапін, Засецкі, Арсенка, Таланкін**, салісты балета **Муллер, Дрэчын, Сталінскі, Узунова, Хераско**, канцэртмейстары: **Жэзмер, Гінзбург, Бычкоў**.

Ажыццявіліся мары

Пачуццё бязмежнай радасці ахапіла мяне, калі я чуў па радыё гістарычную прамову Вячаслава Міхайлавіча Молатава. Веліч і магутнасць вялікай краіны соцыялізма гучала ў ясных, простых і ўпэўненых словах главы совецкага ўрада: «Совецкі ўрад лічыць сваім свяшчэнным абавязкам падаць руку дапамогі сваім братам-украінцам і братам-беларусам, насяляючым Польшчу».

Гэтыя мудрыя словы, сугучныя волі і жаданням усяго совецкага народа, разнеслі па свету чаканую вестку аб вызваленні нашых братоў у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне.

Адбыўся акт вялікай гістарычнай справядлівасці.

Ажыццявілася тое, аб чым марылі, да чаго імкнуліся на працягу дзевятнаццаці год усе сумленныя людзі.

Над прыгнечанай, заняволенай панамі зямлі, палітай крывёю, потам і слязьмі, над спустошанымі палямі і садамі, над пушчамі шматпакутнай Заходняй Беларусі ўзняўся чырвоны сцяг соцыялізма, сцяг Леніна—Сталіна. Пад гэтым сцягам злучыцца ў адно неразрыўнае цэлае ўвесь беларускі народ.

Залатымі літарамі ўпіша ён дзень 17 верасня 1939 года ў сваю гісторыю.

Ад усяго шчырага, усхваляванага сэрца вітаем мы, грамадзяне вольнай, шчаслівай і багатай Совецкай Беларусі, нашых змучаных зарубежных братоў, нашых вызваленых з-пад панскай няволі блізкіх, родных і сваякоў. З гэтага часу мы будзем з вамі ў адной неразлучнай вялікай совецкай сям'і, на адной вялікай совецкай зямлі!

Усе нашы думкі і пачуцці з адважнымі слаўнымі байцамі непераможнай Чырвонай Арміі, якія ажыццяўляюць зараз вялікую гістарычную справу вызвалення прыгнечаных народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Няхай жыве наша соцыялістычная радзіма!

Няхай жыве наша гераічная Чырвоная Армія!

Няхай жыве вялікі правадыр народаў Іосіф Вісарыёнавіч Сталін і яго мудрая нацыянальная палітыка!

Віт. ВОЛЬСКІ.

Міхаіл Міхайлавіч Кацюбінскі

(Да 75-годдзя з дня нараджэння)

17 верасня споўнілася 75 год з дня нараджэння вялікага украінскага пісьменніка-дэмакрата Міхаіла Міхайлавіча Кацюбінскага.

Кацюбінскі ўвайшоў ва украінскую і сусветную літаратуру, як творац непраўзойдзенай аповесці аб рэвалюцыі 1905 года ва украінскім сяле. Імёны герояў гэтай аповесці—Андрэй Волык, Маланка, Гафітка, Марка Гушча сталіназоўнымі для беднякоў, падняўшых сцяг барацьбы супроць сваіх адвечных ворагаў—памешчыкаў і царызма.

Міхаіл Кацюбінскі нарадзіўся 17 верасня 1864 года ў гор. Вінніцы ў сям'і дробнага чыноўніка. З-за недахопу сродкаў ён здолеў скончыць толькі Міргародскую бурсу. З юнацкіх год, пасля смерці бацькі, на яго плечы ляглі матэрыяльныя клопаты аб вялікай сям'і. У 1881—1882 годзе Кацюбінскі зблізіўся з рэволюцыйна-настроенай моладдзю.

Літаратурная дзейнасць Кацюбінскага пачалася з 1884 года. У 1891—1892 г. паявіліся яго першыя апавяданні ў друку («На веру», «Цэпавяз») на тэму аб украінскім сяле.

Падзеі першай рэволюцыі 1905 года аказалі велізарны ўплыў на творчасць М. Кацюбінскага. У 1906-1912 годзе ім былі створаны навелы «Ён ідзе» (аб яўрэйскім пагроме), «Смех» (аб ліберальнай інтэлігенцыі, якая спалохалася чорных сіл рэакцыі), «Коні не вінаваты» (пра памешчыка-лібераладзе), «Інтэрмецца», «Падарунак на імяніны» і іншыя.

З 1903 па 1910 год Кацюбінскі працуе над сваёй выдатнай аповесцю «Фата Моргана». У аснову другой часткі яе пакладзен багацейшы фактычны матэрыял аб сялянскіх паўстаннях у Чэрнігаўскай губерні ў часе рэволюцыі 1905 года.

З 1909 года пачынаецца асабістае знаёмства і дружба Кацюбінскага з вялікім пролетарскім пісьменнікам Горкім. Кацюбінскі тры разы подоўгу гасцяваў на востраве Капры, а ў астатні час ажыўлена перапісваўся з Горкім. Пры садзейнасці Горкага выдавецтва «Знание» надрукавала 2 томы апавяданняў Кацюбінскага на рускай мове. Большэвіцкая газета «Звезда» у № 1 за 1911 год спачувальна адзначыла выхад першага тома твораў М. Кацюбінскага.

Пасля атрымання гэтага тома А. М. Горкі пісаў свайму украінскаму другу: «Кніжку вашу прачытаў з вялікай асалодай». А Кацюбінскі адказаў на гэтыя цёплыя словы: «Калі вам падабаецца, варта пісаць».

Блізкія сяброўскія адносіны спрыялі творчаму ўплыву Горкага на Кацюбінскага. У сваёй сатырычнай навеле «Коні не вінаваты» Кацюбінскі арыгінальна распрацаваў сюжэт 6-й «рускай казкі», незадоўга да таго напісанай Горкім.

25 красавіка 1913 года заўчасна абарвалася жыццё М. Кацюбінскага.

«Вялікага чалавека страціла Украіна. Доўга і добра яна будзе памятаць яго добрую работу», — пісаў Горкі ў сваёй тэлеграме па поваду смерці М. Кацюбінскага.

Кацюбінскі і яго творчасць належаць совецкаму народу. Совецкі чытач любіць і высока цэніць бліскучую вобразную мову і майстэрства твораў М. Кацюбінскага, у якіх пісьменнік паказаў жыццё украінскага народа, прыгнечанага памешчыкамі і царызмам, паказаў барацьбу народа за вызваленне, выкрываў здрадніцтва лібералаў («Коні не вінаваты» і «Смех»), рэакцыйную ролю рэлігіі («Ён ідзе», «Пад мінарэтамі») і г. д.

А. М. Горкі ў сваіх успамінах пісаў: «Чалавецтва, прыгажосць, народ, Украіна — гэта ўлюбёныя тэмы гутарак Кацюбінскага, яны заўсёды былі з ім, як яго сэрца, мозг і слаўныя ласкавыя вочы».

Кацюбінскі верыў ў канчатковую перамогу дэмакратыі, ён любіў жыццё і верыў у перамогу чалавечага розуму. Ён ненавідзеў мяшчанства, насілле і гнёт.

Народы Совецкага Саюза адзначаюць разам з украінскім народам юбілей М. Кацюбінскага, аўтара «Фата Морганы», асабістага друга А. М. Горкага.

Вл. БАГАТЫРОЎ.



Калектыўнае слуханне прамовы па радыё таварыша В. М. Молатава ў Доме пісьменніка БССР.

Фото І. С. Шышко (Фотахроніка БЕЛТА).

М. Ліўшыц

ТРЫ ВЕРШЫ

1. ДРУГУ

Як плён жніва, у барацьбе
Здабытая салодка слава.
Ты заслужыў, мой друг, па праву,
Каб дружбай дзякаваць цябе.
Даль не празрыста: прыдуць дні —
Увесну — сей, улетку — жні.
Прышоўшым ў час — пашана, знаю,
Але я тых люблю ў жыцці,
Хто часу сам дапамагае
Прыйсці.

2. МАЕ СЛОВА

Тады у край мой белай свэрай
Прышлі палякі. Патрулём
Затрыман быў хлапец, каторы
Лістоўкі раздаваў пішком.
— Ах, так! Большэвік! — не утоіш,
Вядома ўсё! — крычаў паляк.
Ён не спрачаўся. Ноччу тою
Больш не прышоў к сваім юнак.
У сырой, скупэй на свет каморы
Прысуда ў путах ён чакаў.
Было чутно: звінелі шпоры...
Ды суд нядоўга засядаў.
— За словы, сеяўшыя смуту,
За бунт, — зачытваў афіцэр, —
Расстрэл табе! Лічы мінуты...
Тады я быў дзіцём, —
цяпер,
Ты чуеш, брат, прыняўшы мукі, —
І я шукаю слоў такіх,
Каб друг за іх пацісн ў рукі,
Каб вораг смерць жадаў за іх.

***

Сягоння пастух ты
І цяню шукаеш,
А заўтра ў далёкі
Палёт вылятаеш.
Сягоння ты ў песні
Прыносіш свой дар,
А заўтра ў пашане
Пастух і пясняр.
Дабіўся вялікага
Ты ураджаю —
Краіна героем
Цябе называе.
Ідзеш ты схаваныя
Скарбы знаходзіць —
Радзіма, як маці,
У дарогу праводзіць.
Дзярзай-жа ў палёце,
Будзь першы ў сяўбе, —
І лепшая слава
Чакае цябе.
І кожны узнае
Тады тваё імя,
Ад краю да краю
Па цэлай радзіме.
І кожны пачуе
Хаду твайго кроку
І ў небе глыбока
І ў моры далёка.

З яўрэйскай мовы пераклаў **А. ЖАЎРУК.**

РУСКІ ЛІТАРАТУРНЫ АЛЬМАНАХ

Беларускае дзяржаўнае выдавецтва здало ў друк альманах рускай секцыі Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. Гэта другі альманах рускай секцыі. Першы вышаў у мінулым годзе. Другі альманах, у якім удзельнічаюць да дзесяці маладых паэтаў і пісьменнікаў, дае ўяўленне аб апошніх творчых працах рускіх літаратурных кадраў Совецкай Беларусі. Многія з твораў перад змяшчэннем у альманах абмяркоўваліся на пасяджэннях рускай секцыі і ў Доме Чырвонай Арміі. Наладжваліся творчыя дэкаднікі Б. Макарцэва, Е. Садоўскага, Л. Шапіра, Авівы Левінай і іншых.

У альманаху друкуюцца новыя вершы К. Цітова, Ал. Шарапава, Ав. Левінай, Сізова, новыя аповесці і апавяданні В. Глазырына, Е. Садоўскага, Л. Шапіра, Зубца і нарыс ваеннага урача Сліцінскага.

Альманах выйдзе ў гэтым годзе.

АБ НОВЫХ АНАНІМНЫХ ПАЭМАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ

(«Панская ласка» і «Васкрасенне Хрыстова»).

У гісторыі беларускай літаратуры другой паловы XIX стагоддзя значнае месца займаюць новыя ананімныя паэтычныя творы: «Панская ласка» і «Васкрасенне Хрыстова», рукапісы якіх знойдзены ў архівах толькі нядаўна. Гэтыя творы пакуль-што нідзе не надрукаваны і будуць выдадзены Інстытутам літаратуры і мовы Беларускай акадэміі навук у асобным зборніку матэрыялаў гісторыі беларускай літаратуры. Аўтары паэм «Панская ласка» і «Васкрасенне Хрыстова» невядомы. Напісаны паэмы, як гэта бачна з тэксту, у парэформенны час.

«Панская ласка»—гэта рэалістычная паэма аб прыгонніцкім ладзе. У ёй даецца рэзкая крытыка паноў-прыгоннікаў. Сюжэт «Панскай ласкі» разгортваецца у наступным плане. Спачатку даецца ўступ, у якім гаворыцца, што пасля рэформы 1861 года мужыку быццам-бы лягчэй стала, бо «на прыгон не цягаюць, а дзеткі і пра паншчыну не знаюць». І тут-жа ва ўспамінах селяніна даецца агульная, вельмі трапная характарыстыка паноў-прыгоннікаў, якія не лічылі прыгонных сялян за людзей:

Панскі хлоп за ўвесь свой век
У іх быў не чалавек.
Зваўся ён,—«сабачый сын»,
Хлоп, бестыя, псякрэў.

І ў канцы ўступа гэтай паэмы гаворыцца аб тым, што паны ўжывалі розныя метады здзеку над працоўным сялянствам. Вуснамі селяніна апавядаецца аб тым, што паны, калі «напасць на сябе пачуюць», то ліслівa называюць «мой дружок», ды і «братцам наракуць, пояць водкай, не дзяруць». І аўтар паэмы заазначае, што з яго героем, селянінам-вартаўніком, таксама здарыўся такі выпадак, калі ён (селянін) «пану дагадзіў», але за гэта яго пан «розгамі ўгасціў». Пасля гэтага ўступа разгортваецца сюжэт твора, у аснову якога пакладзен выпадак, які «адбыўся па зіме, яшчэ лёд быў на зямле». Прыгонны селянін, які днём сек лес, нанач «па войтаўскаму прыказу» быў пастаўлен на варту. На варце ён не вытрымаў і заснуў. На яго нехта пачаў крычаць. Калі вартаўнік прачнуўся, то ўбачыў перад сабою некага ў белым, падобнага, як здалося селяніну, на сатану, які клікаў вартаўніка «падзі сюды». Вартаўнік, прыняўшы пана за чорта, падрыхтаваў дубіну і хацеў яго ўдарыць, але пан закрычаў: «Брацец!» Пасля гэтага пан загадвае склікаць «дворню». У прысутнасці «дворні» пан сказаў, што ён бачыў чорта і хто гэтага чорта зловіць, гаворыць пан, атрымае «водкі кварту». Вартаўнік згаджаецца выканаць панскі загад. Ён пайшоў лавіць чорта, «хадзіць у пацёмках». А пан «чуць жыў», ён спужаўся чорта. Калі вартаўнік злавіў гэтага «чорта», то аказалася, што гэта зусім не «сатана», а «проста шэрая сава». Гэту саву вартаўнік пану паказаў і «як з мёртвых яго ўзняў». Пан даў за гэта вартаўніку гарэлкі. Вартаўнік выпіў гарэлкі, прышоў дамоў і лёг спаць, праспаўшы цэлы дзень і ноч. Раніцою прышоў войт і адвёў яго да ўрадніка. І за тое, што вартаўнік у той-жа дзень пасля начной работы не вышаў на працу, пан загадаў, каб яго за гэта высеклі розгамі. Такім чынам за тое, што вартаўнік пану дагадзіў, пан селяніну сотню розаг адпусціў. Паэма заканчваецца наступнымі словамі: «І так, братцы, праўда ў бога, панская-ж ласка да парога».

Асноўнымі вобразамі паэмы з'яўляюцца прыгонны вартаўнік і пан. Павестванне ў паэме разгортваецца ад імя галоўнага персанажнага вобраза—селяніна-вартаўніка. Сюжэт твора развіваецца ў такім плане, каб паказаць і высмеяць трусасць і нікчэмнасць пана і падкрэсліць перавагу чалавечага характара прыгоннага вартаўніка-селяніна над панам.

Вобраз пана зарысован выключна ў сатырычным плане. Сатырычная зарысоўка знешняга аблічча пана дадзена ў паэме па-мастацку арыгінальна і дасціпна. Калі вартаўнік прачынаецца, дык пан паўстае ў яго вачах у вобразе сатаны:

Стаіць у доме сатана,
Як сняжыначка бела.
Яна не была з хвастом,
Была проста без штаноў,
Да кален белы насоў.
І шапачка срабром шыта,
Галава ёю пакрыта.
З-пад шапанькі тарчыць вуха,
З-пад насова—тоўста бруха.
А мордачка краснавата,
Як казіна—даўгавата.
А вусок тарчыць чарненькі
І чарцёнак не маленькі.
Дай пабачу-ж я і ножкі,
Аж не відна іх ні крошкі.
Чаравічкі толькі відны,
Што за чорт, што без рагоў,
Без хваста, і без штаноў,
Ну, думаю, віць чартоў
Ёсць усякія пароды.

І калі гэты чорт—пан паклікаў вартаўніка да сябе, то вартаўнік узяў кол і, прыгаварваючы, «будзь ты проклят, сатана, заб'ю сукіна сына», пайшоў да яго:

Узяў я кол ды проста к чорту,
Прычыніў, гляджу, ён хверту
І ціхоханька стаіць,
І смірнёханька глядзіць.
Я дубініну рыхтую
І думаю—«сукін сын»,
«Ці дам у галаву, ці ў тую,
А ўсё-ж табе тут амінь».
Падышоў і кол падняў,
Адно чорт і загукаў.

І тут-жа ўся таемнасць раскрываецца. Гэта быў не чорт, а пан, які пачаў прасіць вартаўніка, называючы яго «братцам». Аўтар далей дае трапнае разгорнутае параўнанне пана з чортам, між якімі розніцы амаль-што не было:

Калі праўду вам сказаць,
Ані сколькі не салгаць
Мала розніцы было
Паміж панам і чартом.
Нашы душы прадаваліся,
А над целам надругаліся,
Нашу веру хлопскай звалі
І на бога не зважалі.
Святых дней не пачыталі,
І ў нядзелю застаўлялі
Рабіць пану, як і ў будні,
Білі розгай за марудні.

У паэме «Панская ласка» дадзена глыбокая рэалістычная і тыповая карціна народнага жыцця працоўных беларускіх мас у час прыгонніцкага ладу. Само параўнанне пана з чортам паказвае на тое, што жыццё пры панах было невыносным пеклам, дзе паны, асабліва польскія, бязмерна здзекваліся над беларускім народам і яго звычаямі. Жудасць прыгонніцтва і дзікунства паноў яшчэ больш узмоцнена паказваюцца і раскрываюцца ў паэме ў тым месцы, дзе гаворыцца аб панах, як крывапійцах:

А ўсё-ж пілі нашу кроў,
Дзерлі шкуру, як з скатоў.
Бывала ходзім без штаноў,
Бо знімалі кажды час.
І хадзіць так было нада—
Хлоп быў панская прынада.

Вобраз прыгоннага вартаўніка, над якім здзекваецца пан, паказан у паэме, як прадстаўнік прыгонных сялянскіх мас. Смеласць, дасціпнасць, вынослівасць і стойкасць—гэтыя псіхалагічныя рысы характарызуюць вобраз вартаўніка і з'яўляюцца ўвасабленнем характара самаго народа. Вобраз вартаўніка з разгледжанай паэмы некаторымі рысамі свайго характара нагадвае вобраз палясоўшчыка Тараса з паэмы «Тарас на Парнасе».

Другім арыгінальным ананімным творам, які нідзе яшчэ не друкаваўся, з'яўляецца парадыйна-сатырычная паэма «Васкрасенне Хрыстова». Па свайму мастацкаму характару гэты твор вельмі блізка стаіць да першых помнікаў новай беларускай літаратуры, паэм «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Але ў гэтым творы парадыруюцца і сатырычна высмейваюцца ўжо не героі грэчаскай і рымскай міфалогіі і не літаратурныя класічныя густы дваранства—тут сатырычна парадыруюцца біблія з яе святымі персанажамі.

Персанажныя вобразы, якія дзейнічаюць у разглядаемым творы, узяты з біблії. У аснову яго сюжэта пакладзена апокрыфічная легенда «Васкрасенне Хрыста і сашэствіе яго ў пекла». У цэнтры міфічны вобраз Хрыста, якога акружаюць цэлыя галерэі біблейскіх асоб. Вось Марыя, якая «сярод ночы, іза ўсёй пусцілась мочы, галасіць на гроб Хрыстоў, на галгофу меж храстоў паздзірала дужа ногі аб каменні». І тут-жа яна «пасустрэціла Хрыста, які ёй сказаў спраста: «Чаго, матушка, ты плачаш? Я-ж ужо васкрос, як бачыш».

Далей рэзка парадыруецца, сатырычна высмейваецца біблейская легенда пра Адама і Еву. Чорт узяў «качарэжку ў лапы» і, памяшаўшы ёй у «жаркай печцы», дастаў адтуль Еву, у якой «абгарэлі плечкі». За ёй вылез і Адам... Хрыстос паглядзеў на іх і спужаўся сам, як убачыў Адама, пачарнеўшага «ад жару». Ён быў страшны: «запаў з голаду жывот, ды і збіў-жа яго чорт». Перад Хрыстом «Адам слёзкамі заліўся, яму ў ногі пакланіўся, у нагах яго ляжаў і на Еву паглядаў». Тады Хрыстос узяў Адама за руку і сказаў яму: «Бяжы з Евай скарэй у рай»:

Адам з пекла задаў драла,
З ім чуць Ева паспявала,
Шыбка бег ён, аж спацеў,
Зато-ж першым прыляцеў
І з сабою цэлу зграю
Ён прывёў да божжа раю.

І далей трапна парадыруецца вось гэта «зграя» біблейскіх асоб, якія ўслед за Адамам беглі ў рай. Тут быў «асілак Самсон, што быў дужа лас на сон». За ім бег Маісей, які наскочыў на Самсона і «падняў яго скарэй, што-б дарогу даць Якубу», а ззаду яго «Ільля ехаў на канях і гром пушчаў такі, аж страх». За Ільёй «пёрся Елісей», які «нёс армяк у руцэ сваёй», «А за ім святы Яфет нёс і шаблю і мушкет». Тут-жа «забыўшы стару драку, шоў Абрам на бок Ісаку», абганяючы Лота. «Мой старанькі» таксама тут «таптаўся» і да раю «прадзіраўся», «прамудры Саламон зазваніў у райскі звон». Такім чынам усе святыя прышлі да раю. У гэты час, калі святыя прышлі да раю, «прабудзіўся цар Давыд», які «скрыва глянуўшы да Хама, пацягнуўся да Абрама». У раю наладжваецца пірушка. Усе святыя садзяцца за стол і зусім на сялянскі манер, так як у паэме «Тарас на Парнасе» міфалагічныя багі, біблейскія святыя пачынаюць піць, закусваць і танцаваць:

Селі радышкам за стол,
Ім падалі хлеб і соль,—
І па чарцы красна піва.
Тут Давід надзелаў дзіва:
Ён ударыў ў гуслі так,
Што скакаць хацеў усяк.
Сара кінула і ложку,
Паскакала у прыскочку,
А за нею і Рахіль...
Лія кінула кастыль
Ды як ударыць трэпака,
Аж Сусанна із садка
На Данілу паглядзела
І у танец паляцела.
Тут прыгожая Эсфір
Красну вынесла псалтыр,
Прад Давідам разварнула
І зайграць яго таўхнула.
Засмяяўся гасподзь-бог,
Тут і бабы, тут і ўнукі
Усе пабраліся за рукі,
Пашлі бойка ў харавод.

Тут, як і ў паэме «Тарас на Парнасе» асноўным мастацкім прыёмам з'яўляецца гратэскнае парадыраванне вобразаў, якія ўжо ўзяты з біблії. Біблейскія асобы ў даным выпадку зніжаюцца: яны ставяцца ў звычайную абстаноўку сялянскай гулянкі і такім шляхам набываюць смяхотна-парадыйны выгляд.

Па сваіх паэтычных якасцях—лёгкасці і напеўнасці рытмікі, народнай прастаце і каларытнай яркасці мовы, «Панская ласка» і «Васкрасенне Хрыстова», як крытычна-рэалістычныя творы ў беларускай літаратуры другой паловы XIX ст., вылучаюцца і маюць сваё пэўнае гістарычнае значэнне ў нашай літаратурнай спадчыне.

Міх. ЛАРЧАНКА.

Нам. адказнага рэдактара Я. ГЕРЦОВІЧ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка, Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Л—2562